Голас Радзімы

№ 39 (1403) КАСТРЫЧНІК 1975 г. ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ ГОД ВЫДАННЯ 20-ТЫ ЦАНА 2 КАП.

ул Красноармейская 9
Гос б-ка им Ленина

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ БАЗА ВЁСКІ

Тое пасяджэнне навуковага савета Інстытута эканомікі Акадэміі навук БССР не паходзіла на звычайную абарону кандыдацкай дысертацыі. Па-першае — з-за ўзросту дысертанта. Якаў Аляксанкін быў не намнога маладзейшы за сваіх сівых апанентаў, эканамістаў з гучнымі тытуламі. А па-другое, у анкеце прэтэндэнта на першую вучоную ступень было запісана, што ён працуе старшынёй калгаса імя Калініна Нясвіжскага раёна. Усе ж прысутныя ведалі, як цяжка бывае на такой клапатлівай пасадзе вышукаць хоць паўгадзіны ў суткі на «пабочныя» заняткі. І тым не менш, абарона дысертацыі па тэме «Сацыяльныя пераўтварэнні вёскі ва ўмовах калгаснага ладу» прайшла паспяхова. Апаненты адзначылі, што Якаў Аляксанкін першым у рэспубліцы даў глыбокі і змястоўны аналіз дыялектыкі грандыёзных вытворчых, матэрыяльных і культурных змен, што адбыліся ў савецкай вёсцы з часоў калектывізацыі.

Матэрыял для абагульненняў даследчык браў, што называецца, пад рукамі, з гісторыі свайго калгаса, з жыцця аднавяскоўцаў, якіх ён добра ведаў. Таму і вывады, атрыманыя ў дысертацыі, вызначыліся асаблівай дакладнасцю.

З таго часу мінула некалькі год. Яшчэ заможней зажылося землякам Якава Аляксанкіна, яшчэ больш прыбыткаў стала прыносіць грамадская гаспадарка. За выдатныя паказчыкі калгаса яго старшыня атрымаў ордэн Леніна. Імя яго, як кіраўніка перадавога калгаса і як вучонага, стала вядомым у рэспубліцы. Але Якаў Васільевіч па-ранейшаму застаецца жыць і працаваць у калгасе, адвяргаючы самыя «спакуслівыя» прапановы аб пераходзе на навуковую работу ў сталіцу. Ён перакананы, што ў сучаснай вёсцы, якая імкліва ідзе па шляху навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу, для вучонага, для чалавека інтэлектуальнага не менш цікавых спраў, чым у горадзе.

Так лічаць яшчэ дзесяткі старшынь і вядучых спецыялістаў калгасаў, што без адрыву ад асноўнай работы абаранілі кандыдацкія дысертацыі і працягваюць сваю дзейнасць на ранейшых пасадах «практыкаў». Такая, наогул, думка ў сотень тысяч інтэлігентаў, што плённа працуюць зараз у беларускай вёсцы, вызначаючы яе сучаснае інтэлектуальнае аблічча...

Сельскі інтэлігент. Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў назад гэта словаспалучэнне ў гаворцы беларусаў выкарыстоўвалася зусім рэдка, бо адукаваныя людзі, а тым больш людзі разумовай працы, здараліся ў тагачаснай вёсцы не часта. Звычайна, гэта быў падзвіжнік-настаўнік, які

[Заканчэнне на 2-й стар.]

Спецыялісты саўгаса «Ждановічы» Канстанцін ГАНЧАРЭНКА, Марыя КАЖАМЯКА і Зоя ГУРЫНОВІЧ сабраліся на дыспетчарскім пункце гаспадаркі. Фота Я. КАЗЮЛІ.

МАГІСТРАЛЬ СКЛІКАЕ РАМАНТЫКАЎ
[«Якуцкі мерыдыян»]
стар. 3, 4

АБ ЧЫМ СВЕДЧАЦЬ СЛОВЫ І ЎЧЫНКІ ЛЮДЗЕЙ
[«Ложь во спасение»]
стар. 5

ВЕРШЫ ПІШУЦЦА ТУТ САМІ...
[«Восень у Каралішчавічах»]
стар. 6—7

БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ

АГЛЯД НАВІН

У большасці паведамленняў, дзе расказваецца аб падзеях міжнароднага жыцця, у якіх прымала ўдзел Беларуская ССР, увагу на сябе звяртае слова «дружба». Гэта натуральна, бо афіцыйныя пасланцы нашай краіны за рубяжом — заўсёды праваднікі палітыкі, у аснове якой ляжаць прынцыпы добрасуседскага суіснавання, мірнага супрацоўніцтва і ўзаемаразумення. Ва ўсіх афіцыйных або сяброўскіх сустрэчах, проста ў паўсядзённых замежных кантактах або прымаючы гасцей з іншых краін у сябе дома, савецкія людзі верныя гэтым прынцыпам. Так можна ацэньваць запрашэнне ў Венгерскую Народную Рэспубліку дэлегацыі Вярхоўнага Савета СССР, якую ўзначаліў член Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. Машэраў. Дэлегацыю, якая прыбыла ў ВНР з афіцыйным дружалюбным візітам, цёпла сустрэлі ў Будапешце члены Палітбюро Венгерскай Сацыялістычнай Рабочай Партыі і ўрада рэспублікі. Савецкія госці прысутнічалі на цырымоніі адкрыцця сесіі Дзяржаўнага сходу ВНР.

У верасні нашу рэспубліку наведала дэлегацыя Таварыства брытана-савецкай дружбы, якая прыбыла ў Савецкі Саюз па запрашэнню Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Член англійскага парламента ад лейбарысцкай партыі Майкл Інгліш сказаў: «Мы разглядаем нашу місію як выражэнне добрых пачуццяў англійскага народа да савецкіх людзей, разам з якімі мы змагаліся ў гады другой сусветнай вайны супраць фашызму». Англійскі парламентарый падкрэсліў важнае значэнне расшырэння сувязей паміж Нотынгемам і Мінскам для ўмацавання дружбы англійскага і савецкага народаў.

У час сустрэчы з актывістамі Мінскага гарадскога аддзялення Таварыства «СССР—Вялікабрытанія» госці абмеркавалі пытанні далейшага развіцця культурных сувязей паміж беларускай і англійскай грамадскасцю. У Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі члены дэлегацыі азнаёміліся з сістэмай падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, а ў санаторыі «Крыніца» — з арганізацыяй адпачынку працоўных. Два дні актывісты англійскага таварыства дружбы правялі ў Гомелі, дзе пабывалі ў выканкоме гарсавета, у Палацы піянераў, на заводзе «Гомсельмаш» і іншых прадпрыемствах, цікавіліся аховай здароўя і жыллёвымі ўмовамі рабочых.

Не менш цікавымі і насычанымі былі дні знаходжання ў Беларусі дэлегацыі Ронскага дэпартаменцкага камітэта таварыства «Францыя—СССР» на чале з генеральным сакратаром камітэта, генеральным саветнікам дэпартамента Рона Рэнэ Дэгранам. Пад час паездкі па славутых мясцінах Беларусі госці наведалі мемарыяльны комплекс Хатынь. Члены дэлегацыі прывезлі з сабой зямлю французскіх вёсак Арадур і Сен-Жэні-Лаваль, знішчаных фашыстамі. З выпадку перадачы свяшчэнных рэліквій адбыўся мітынг.

«Сімвалічна, што ганаровы акт перадачы зямлі, — сказаў, адкрываючы мітынг, намеснік старшыні выканкома Мінскага гарсавета М. Жукоўскі, — адбываецца ў год 30-годдзя Вялікай Перамогі над фашызмам, у якую велізарны ўклад унёс савецкі народ, а таксама лепшыя сыны і дочкі Францыі. Ён адбываецца неўзабаве пасля паспяховага завяршэння трэцяга заключнага этапа агульнаеўрапейскай нарады. Савецкія людзі ўспрынялі падпісаных на ёй дакументы як важны крок да ўмацавання міру, развіцця супрацоўніцтва ў Еўропе».

«Узяцце зямлі Арадура і Сен-Жэні-Лаваля, якую мы даставілі ў Хатынь,—сказаў у слове ў адказ Рэне Дэгран,—ператварылася ў Францыі ў вялікую палітычную кампанію. Французскі народ цэніць дружбу з савецкім народам, свята захоўвае памяць аб сумеснай барацьбе супроць фашызма».

Нядаўна грамадскасць свету шырока адзначыла 30-годдзе ўтварэння Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. Тры дзесяцігоддзі народ гэтай краіны заняты мірным будаўніцтвам. Вялікую дапамогу ў гэтым яму аказвае Савецкі Саюз, усе яго братнія рэспублікі. Так, нядаўна ў Мінск прыбылі спецыялісты сельскай гаспадаркі ДРВ. Дваццаць в'етнамскіх інжынераў пройдуць курс навучання на Мінскім трактарным заводзе. Краіна, дзе пачалося ажыццяўленне першага этапа механізацыі сельскай гаспадаркі, мае вялікую патрэбу ў высокакваліфікаваных кадрах. Дарэчы, дзве трэці ўсяго трактарнага парку ДРВ складаюць машыны з маркай «Беларусь».

Заключнай палітычнай падзеяй месяца стала адкрыццё ў Мінску III фестывалю Дружбы савецкай і балгарскай моладзі. У Мінск прыбылі шматлікія госці з Балгарыі. У братнюю народную рэспубліку паехалі пасланцы з Беларусі.

ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ●

ТЭЛЕФОН ВА ЎСІХ КАЛГАСАХ

Закончана ўнутрыгаспадарчая тэлефанізацыя ў калгасе «Маладая гвардыя» Чэрыкаўскага раёна. Апараты аўтаматычнай тэлефоннай сувязі ўстаноўлены на жывёлагадоўчых фермах, у культурна-бытавых памяшканнях, у многіх кватэрах хлебаробаў.

Цяпер ва ўсіх 11 калгасах раёна ўстаноўлены АТС.

СУПРАЦОЎНІЧАЮЦЬ МАШЫНАБУДАЎНІКІ

На мінскім заводзе дарожнага машынабудавання «Ударнік» наладжана серыйная вытворчасць новага віда аднакаўшовага франтальнага пагрузчыка. Шасі для новай машыны вырабляюцца ў Беларусі, вядучыя масты для яго па чарцяжах савецкіх спецыялістаў робяцца ў Югаславіі, каробкі перадач — у Польшчы, гідрацыліндры —у Чэхаславакіі.

Грузападымальнасць пагрузчыка — 3 тоны. Ён знойдзе шырокае прымяненне на пагрузцы кавалкавых і сыпучых матэрыялаў, на будаўнічых і іншых работах.

Машына мае вялікую скорасць і добрую манеўранасць, што дае магчымасць выкарыстоўваць яе і ў якасці цягача.

КАМБІНАТЫ БЫТУ

Дом быту здадзены ў эксплуатацыю ў вёсцы Грыўда Івацэвіцкага раёна. Комплексныя прыёмныя пункты пабудаваны ў сёлах Баранавіцкага, Ганцавіцкага, Пінскага, Столінскага і іншых раёнаў. Цяпер у сельскай мясцовасці іх налічваецца больш як 250.

Бытавое абслугоўванне насельніцтва пераводзіцца на індустрыяльную аснову. Ва ўсіх гарадах і раённых цэнтрах Брэсцкай вобласці створаны спецыялізаваныя камбінаты, у якіх ёсць швейныя атэлье і майстэрні па рамонту складанай бытавой тэхнікі. У шэрагу месц пабудаваны атэлье па вязцы і рамонту трыкатажу.

З пачатку пяцігодкі аб'ём бытавых паслуг у вобласці ўзрос амаль на 60 працэнтаў. Толькі сёлета на развіццё прадпрыемстваў быту выкарыстана 400 тысяч рублёў.

✦

Васіль ЛОГАШ — старэйшы лесавод рэспублікі. Ён узначальвае Свіцязянскае лясніцтва. Сваім веданнем роднай прыроды лесавод шчодра дзеліцца са школьнікамі, выхоўваючы ў дзятвы любоў да лесу.

НА ЗДЫМКУ: В. ЛОГАШ і яго юныя памочнікі Зіна ГАНЧАРУК і Саша БЯЗМЕН з Валеўскага школьнага лясніцтва.

Фота А. ПЕРАХОДА.

ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ●

ДРУГІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

Сёлета споўнілася шэсць гадоў, як у Гомелі адкрыўся другі ў нашай рэспубліцы дзяржаўны універсітэт. За гэты параўнаўча невялікі тэрмін маладая навучальная ўстанова ператварылася ў адзін з буйнейшых цэнтраў навукі і падрыхтоўкі спецыялістаў. На яго дзённых і вячэрніх факультэтах вучацца каля сямі тысяч юнакоў і дзяўчат. Падрыхтоўка іх вядзецца па 10 спецыяльнасцях і 24 спецыялізацыях.

На 36 кафедрах працуе звыш 400 высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Для чытання спецыяльных курсаў прыязджаюць вучоныя з Маскоўскага, Ленінградскага і Беларускага універсітэтаў, Акадэміі навук БССР.

— Рэктарат, — расказвае рэктар універсітэта, член-карэспандэнт АН БССР Барыс Бокуць, — імкнецца ўвязаць з запатрабаваннямі народнай гаспадаркі горада, вобласці і рэспублікі не толькі падрыхтоўку маладых спецыялістаў, але таксама і навукова-даследчую работу ўсіх кафедр. Нашымі лабараторыямі становяцца цэхі прадпрыемстваў, будаўнічыя пляцоўкі, канструктарскія і праектныя бюро.

Вучоныя універсітэта склалі план вывучэння прыродных рэсурсаў Палесся і выкарыстання іх у народнай гаспадарцы. У мінулым годзе быў вывучаны і абагульнены вопыт работы шэрагу прадпрыемстваў Гомельскай вобласці па ўдасканаленню гаспадарчага разліку, структуры і шляхоў лепшага выкарыстання асноўных вытворчых фондаў.

...У Гомельскага дзяржаўнага універсітэта вялікая будучыня. Нядаўна зацверджан праект новага універсітэцкага гарадка. Ён зойме 40 тысяч квадратных метраў — амаль у два разы больш, чым цяпер. Гарадок вырасце ў самым маляўнічым месцы Гомеля, на правым беразе ракі Сож, побач з вялікім загарадным паркам.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ БАЗА ВЁСКІ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.]

марна намагаўся выцягнуць з цемры невуцтва дзяцей спрадвеку непісьменных сялян. Каб хоць зрэдку пагутарыць з адукаваным чалавекам, яму даводзілася адпраўляцца часам за дзесяткі вёрст ажно ў другі бок павета. Тыя нашы чытачы, хто памятае дарэвалюцыйную беларускую вёску, добра ведаюць гэта.

Сацыялізм, калектыўны лад гаспадарання на зямлі карэнным чынам ператварылі не толькі матэрыяльны побыт сялян, але адкрылі ім дарогу да ведаў, што змяніла сацыяльны састаў сельскага насельніцтва.

Сёння, паводле даных статыстыкі, інтэлігенцыя складае на вёсцы даволі значную частку яе жыхароў. Хто ж гэтыя людзі? Урачы і інжынеры, аграномы і заатэхнікі, эканамісты і псіхолагі-выхавацелі. Гэта і знаёмая ўжо нам фігура настаўніка, але не адзінокага і таму бездапаможнага, а працуючага ў адным калектыве з дзесяткамі дыпламаваных выкладчыкаў, у буйных, аснашчаных накшталт навуковых лабараторый школах. Гэта і работнікі культуры — мастакі, прафесійныя музыканты і рэжысёры-пастаноўшчыкі, бібліятэкары і нават архітэктары, якім, дарэчы, у сучаснай вёсцы сядзець без справы не даводзіцца. Большая частка гэтых людзей—выхадцы з вёскі.

Самы буйны, хоць, напэўна, і самы малады па свайму ўзросту,—атрад тэхнічнай інтэлігенцыі. Яго складаюць спецыялісты сельскай вытворчасці. Гэта ўжо неаспрэчны факт, што тэхнічны прагрэс зрабіў сапраўдную рэвалюцыю ў працэсе вытворчасці традыцыйных прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі. Буйныя, кіруемыя аўтаматыкай комплексы-заводы замест састарэлых ферм, канвеер высокапрадукцыйных машын на палях, што цалкам вызваляюць хлебароба ад ручной працы, — вось сённяшнія рабочыя месцы і прылады працы селяніна. Зразумела, што такая тэхніка можа добра падпарадкоўвацца толькі чалавеку высокаадукаванаму, з багажом шматбаковых ведаў. Вось і з'явіліся ў вёсцы спецыяльнасці з «гарадскімі» назвамі: інжынер па аўтаматызацыі, інжынер па навуковай арганізацыі працы, інжынер-электрык, аператар дыспетчарскай сувязі, інжынер па газаваму абсталяванню і кантрольна-вымяральных прыборах...

Падлічана, што ў сярэднім у кожным беларускім калгасе працуюць 17 вядучых спецыялістаў. Штогод пяць сельскагаспадарчых інстытутаў рэспублікі выпускаюць каля 4 000 спецыялістаў па 15 спецыяльнасцях. У 25 тэхнікумах рыхтуюць кіраўнікоў сярэдняга звяна па 18 галінах. Да гэтага трэба дадаць, што кіруючыя кадры для сяла рыхтуюць абодва універсітэты, педагагічныя, медыцынскія, політэхнічны інстытуты і інстытут народнай гаспадаркі. Уся гэта армія моладзі штогод папаўняе рады сельскай інтэлігенцыі.

У сувязі з гэтымі лічбамі ўспамінаецца нядаўняя гутарка з дырэктарам саўгаса «Ждановічы» Мінскага раёна Феліксам Брыкетам. Яна адбылася ў прасторным кабінеце гаспадара, дзе ўсё — рацыянальны камфорт, мэбля, селектар сувязі на стале і нават строгая цішыня — нагадвала хутчэй абстаноўку якога-небудзь сталічнага офіса, чым такую звыклую нам мітусню і сціпласць звычайнай калгаснай канторы. Ды і сама Кунцаўшчына — цэнтр саўгаса — асфальтаваная, шматпавярховая, была падобна на вынесены ў поле гарадскі мікраён. Толькі зялёныя кліны садоў, што ўпіраліся проста ў белакаменныя фасады, ды перааараныя ўжо бульбянішчы на ўзгорках гаварылі аб занятку яе жыхароў.

Дырэктар расказваў аб тым, што яго гаспадарка сваімі маштабамі, аснашчанасцю, нават рытмам работы не ўступае буйным прамысловым прадпрыемствам. Асноўныя фонды саўгаса набліжаюцца да 12 мільёнаў рублёў. Тут больш за паўтараста машын і агрэгатаў, гіганцкі цяплічны камбінат — 14 гектараў пад шклом, радыё і тэлеметрычная сувязь, усе фінансавыя разлікі вядуцца на электронна-вылічальнай машыне... «І я ўжо зусім не ўяўляю плённую жыццядзейнасць гэтага складанага арганізма без працы дзесяткаў высокаадукаваных спецыялістаў, нашай інтэлігенцыі», — дадаў дырэктар.

Але мы сказім партрэт сучаснай сельскай інтэлігенцыі, калі абмяжуемся паказам толькі яе вытворчай ролі. Вясковы інтэлігент — гэта яшчэ і выхавацель, прапагандыст усяго перадавога ў культуры, ведах, традыцыях. Прыгледзьцеся да грамадскага жыцця ў вёсках. Зараз там не рэдкасць мясцовыя краязнаўчыя музеі, зборам некаторых сельскіх бібліятэк могуць пазайздросціць гарадскія кнігасховішчы, усюды — буйныя палацы і дамы культуры, на сцэнах якіх рэгулярна выступаюць прафесійныя тэатры з горада. У гэтых жа палацах праходзяць заняткі гурткоў мастацкай самадзейнасці, народных універсітэтаў культуры, чытаюцца лекцыі. І ўсюды арганізатарамі самых цікавых пачынанняў, часта на грамадскіх пачатках, з'яўляюцца сельскія інтэлігенты.

...У сваёй кандыдацкай дысертацыі Якаў Аляксанкін сцвярджаў, што адным з характэрных прызнакаў станоўчых сацыяльных пераўтварэнняў на вёсцы з'яўляецца павышэнне адукацыйнага і культурнага ўзроўню яе жыхароў, рост інтэлектуальнай базы сяла. Жыццё пацвердзіла вывады вучонага. Цяпер гэты працэс праходзіць асабліва бурна. І таму мы, беручы ў рукі бохан хлеба, усведамляем, што ў ім увасоблена праца не толькі трактарыста ці камбайнера, але і тых людзей, якія аддаюць вёсцы багацце сваіх ведаў.

ШКОЛА-ЗАВОД

У Мінску адкрыўся міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат працоўнага навучання і прафесіянальнай арыентацыі вучняў Першамайскага раёна. Гэта чацвёрты па ліку палац працы школьнікаў у беларускай сталіцы.

На трох паверхах размясціліся вучэбныя аўдыторыі, майстэрні, цэхі, у якіх 1 600 вучняў старэйшых класаў раёна будуць авалодваць ведамі па абраных спецыяльнасцях. У будучым навучальным годзе вытворчае навучанне тут пройдуць больш як 3 000 школьнікаў.

СТАНУЦЬ ЖЫТНІЦАЙ БАЛОТЫ

Будаўніцтва вялікай меліярацыйнай сістэмы пачалося ў басейне Дняпроўска-Бугскага канала. Яна прадухіліць затапленне масіваў зямель, якія ў час паводак нярэдка ператвараюцца ў бяскрайнія азёры. Будзе пракладзена сетка каналаў і дарог, пабудуецца дзесяцікіламетровая ахоўная дамба. Больш чым на 70 гектарах разальецца вадасховішча. Шлюзы і помпавыя станцыі забяспечаць рэгуляванне вільгаці ў глебе, арашэнне палёў, культурных лугоў і пашы.

ПАМЯЦІ ЗАГІНУЎШЫХ

У верасні 1942 года ў сяле Дрэмлева Жабінкаўскага раёна гітлераўцы спалілі жывымі 286 жыхароў — дзяцей, жанчын і старых.

У памяць аб загінуўшых насыпаны Курган славы. Па ўстаноўленай традыцыі тут штогод праходзяць мітынгі, прысвечаныя памяці загінуўшых. Такі мітынг адбыўся і сёлета. Прысутныя на ім усклалі жывыя кветкі да курганапомніка.

РОССЫПЫ ЯГАД

У асеннім лесе з'явіліся чырвоныя россыпы: паспелі журавіны і брусніцы. Пачаўся іх збор. Для прыёмкі ягад адкрыты сотні пунктаў. Дары лета паступілі на перапрацоўку. Для вырабу соку і кансерваў прадпрыемствы рэспублікі выкарыстаюць пяць тысяч тон ягад. Зімой гаспадыні пададуць да стала смачныя лясныя вітаміны.

ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ РАЎБІЧАЎ

У канцы верасня ў Раўбічах — спартыўным комплексе пад Мінскам — праведзена першынство СССР па летняму біятлону. Гэтыя спаборніцтвы адрозніваюцца ад зімовых тым, што бягуць спартсмены не на лыжах, а на лыжаролерах. Напярэдадні спаборніцтваў праведзены вялікія работы. Перад стрэльбішчам з'явілася асфальтаваная пляцоўка плошчай 5 000 квадратных метраў, дзе спартсмены будуць бегаць штрафныя кругі пры няўдалай стральбе. Завершаны асобныя работы на пяцікіламетровай лыжаролернай трасе. Яна праходзіць па тых участках, дзе была зімовая асноўная траса леташняга чэмпіянату свету. Гэта першая ў краіне такая спецыялізаваная дарожка.

ПАДЗЕІ ● ФАКТЫ ● ЛЮДЗІ ● ПАДЗЕІ ● ФАКТЫ ● ЛЮДЗІ ● ПАДЗЕІ ● ФАКТЫ ● ЛЮДЗІ ● ПАДЗЕІ ●

ЯКУЦКІ МЕРЫДЫЯН

ВОСЬ УЖО ДРУГІ ГОД КАРОТКАЕ І ЗВОНКАЕ СЛОВА БАМ (ТАК СКАРОЧАНА НАЗЫВАЮЦЬ САМУЮ ВЯЛІКУЮ У КРАІНЕ БУДОУЛЮ ПЯЦІГОДКІ—ЧЫГУНАЧНУЮ МАГІСТРАЛЬ АД БАЙКАЛА ДА АМУРА) З'ЯУЛЯЕЦЦА СІМВАЛАМ ВЕЛІЧЫ НАШЫХ СТВАРАЛЬНЫХ ПЛАНАУ І ПАТРЫЯТЫЗМУ САВЕЦКІХ ЛЮДЗЕЙ. НА БУДАУНІЦТВА ЧЫГУНКІ У СІБІР З'ЕХАЛІСЯ ПРАДСТАУНІКІ 71 НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ СССР. У ІХ ЛІКУ НЯМАЛА ПАСЛАНЦОУ БЕЛАРУСІ. ЛЕТАСЬ У КРАСАВІКУ ТУДЫ ВЫЕХАЛА ГРУПА БУДАУНІКОУ НА ЧАЛЕ З АЛЯКСАНДРАМ НІКІЦЕНКАМ. А ВЯСНОЙ ГЭТАГА ГОДА—ВЯЛІКІ МАЛАДЗЕЖНЫ АТРАД ІМЯ МІКАЛАЯ КЕДЫШКІ. РАЗАМ З ДОБРААХВОТНІКАМІ НА ТРАСУ МАГІСТРАЛІ ПАЕХАУ МІНСКІ ЖУРНАЛІСТ УЛАДЗІМІР ПАУЛОВІЧ. НІЖЭЙ ДРУКУЕМ ЯГО НАТАТКІ.

НА БУДОЎЛЮ ПА КОНКУРСУ

У вагоне поезда Масква — Хабараўск, якім мы ехалі на БАМ, побач са мной аказалася цэлая група мінчан: Валерый Таранаў, Сяргей Вярвільскі, Яўген Паўлюкевіч, Вячаслаў Рачок, Георгій Акудовіч. Яны і раней разам працавалі на заводзе жалезабетонных вырабаў, пасябравалі і на БАМ таксама падаліся разам. Але зрабіць гэта было не так проста. Занадта шмат жадаючых было ехаць на славутую будоўлю, многім хацелася «свет пабачыць і сябе выпрабаваць». Таму для прэтэндэнтаў наладзілі... конкурс, як у інстытут. Мае суседзі вытрымалі яго, бо за плячыма ў кожнага, нягледзячы на маладосць, немалы вопыт работы.

Па традыцыі сярод добраахвотнікаў распаўсюдзілі спецыяльную анкету. Першым у ёй было пытанне: «Чаму вы вырашылі паехаць на БАМ?» Запоўніла такую анкету і мінчанка Вера Агафонава. Раней яна працавала штампоўшчыцай, машыністам халадзільных установак, потым паступіла ў інстытут, а цяпер — пуцёўка на БАМ. Вось як адказала Вера на першае пытанне: «Галоўнае — жаданне выпрабаваць сябе. І вельмі хочацца, каб недзе на зямлі, на карце была яшчэ адна кропка, аб якой я магла б сказаць: гэта мой горад, мая станцыя».

Іван Козел на першае пытанне анкеты адказаў так: «Некалі мой дзед удзельнічаў у будаўніцтве Транссібірскай чыгункі. Бацька стаў машыністам поезда, а я скончыў чыгуначны тэхнікум і вырашыў пачаць сваё працоўнае жыццё ў сібірскай тайзе».

Прыкладна такія ж былі адказы і ў іншых членаў будаўнічага атрада імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Кедышкі.

ТАКТЫКА І СТРАТЭГІЯ МАГІСТРАЛІ

Пасля шасцісутачнага падарожжа ў поездзе мы працягвалі свой шлях на аўтобусах па славутай Амура-Якуцкай магістралі. Яшчэ нядаўна яна была адзінай артэрыяй, якая звязвае Якуцію і ўвесь паўночны ўсход краіны з Транссібірскай чыгункай і Амурскай вобласцю. А зараз нараджаецца яе стальны спадарожнік або так званы малы БАМ. Першы ўчастак яго працягласцю 180 кіламетраў ужо здадзены ў эксплуатацыю. Ён мае вялікае значэнне, таму што злучыў дзеючую Транссібірскую чыгунку з будучай Байкала-Амурскай магістраллю і даў магчымасць будаўнікам весці далейшае наступленне шырокім фронтам — на захад, поўнач і ўсход. Участак шляху, што ідзе на поўнач, будзе свайго роду чарадзейным ключом, які адкрывае непасрэдны доступ да незлічоных багаццяў Паўднёвай Якуціі. Такое спалучэнне прыродных выкапняў у адным раёне прызнана непаўторным, амаль адзіным у свеце. Вось чаму прынята рашэнне аб будаўніцтве Паўднёваякуцкага вугальнага комплексу, у які ўвойдзе шэраг буйных металургічных прадпрыемстваў. Там ужо вырастае горад Нюрынгры, дзе будзе жыць сто тысяч чалавек. Дарога Тында — Беркакіт — толькі пачатак будучай Паўночна-Усходняй магістралі, што пройдзе далей праз гарады Алдан, Гамот, Якуцк і адыграе неацэнную ролю ў развіцці ўсяго паўночнага ўсходу СССР.

Беларусам выпаў гонар будаваць самы цяжкі, паўночны ўчастак БАМа. Там, на якуцкім мерыдыяне, і высадзіўся ў пачатку красавіка 1975 года першы «дэсант» атрада імя Мікалая Кедышкі.

Галоўныя задачы атрада былі: будаваць буйны жылы пасёлак і стальную магістраль, весці наступленне адразу на два франты. Прычым кожны з іх мае асаблівае значэнне. Першы — таму, што часы брызентавай палаткі, якая была ў свой час сімвалам рамантыкі, беззваротна адыходзяць у мінулае. Сёння людзі і ў тайзе хочуць жыць з выгодамі, і не выпадкова будаўніцтва БАМа ўсюды пачынаецца са стварэння нармальных умоў для жыцця і адпачынку ўсіх, хто пракладвае або будзе абслугоўваць стальную магістраль. А другі

(Заканчэнне на 4-й стар.)

«ЗАМЕСТ ПЕРСІДСКАГА ЎЗОРУ...»





Размераны гул машын раз-пораз перарываецца звонкімі «стрэламі» чаўнакоў. Тысячы рознакаляровых ніцей, як прамені сонца, сабраныя гіганцкай лінзай, збягаюцца да ткацкіх станкоў, ператвараючыся ў яркія пушыстыя дываны.

Каля дзвюх тысяч кватэр штодзень можна ўпрыгожыць дыванамі Брэсцкага вытворчага дыванова-суконнага аб'яднання.

Сучаснае тэхналагічнае абсталяванне дазваляе ствараць дываны, якія адпавядаюць самым высокім патрабаванням. Нездарма дваццаці з сарака шасці маркаў дываноў, якія выпускае аб'яднанне, прысвоены дзяржаўны Знак якасці.

НА ЗДЫМКАХ: тут нараджаюцца брэсцкія дываны; над эскізам новага дывана працуе мастак Уладзімір ГУСЕЎ; так робіць зашыфроўку малюнка дывана на перфакарту; кантралёр гатовай прадукцыі Надзея РОЙ.

Тэкст і фота Я. КАЗЮЛІ.

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

ЗАВОДЫ ДЛЯ КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА

Завод, які ўведзен у дзеянне ў раённым цэнтры Ганцавічы на Брэстчыне, выпусціць у гэтым годзе буйныя панелі для 60 чатырохпавярховых жылых дамоў. Яны будуць пабудаваны ў новых пасёлках саўгасаў, якія ствараюцца на асушаных землях Палесся.

Гэта — дзесятае буйное прадпрыемства, якое выпрабляе панелі, аб'ёмныя блокі-пакоі і іншыя канструкцыі для будаўніцтва жылых, культурна-бытавых і вытворчых будынкаў у сёлах рэспублікі. Архітэктары прадставілі ў распараджэнне мантажнікаў тыпавыя праекты шматкватэрных дамоў. Гарадскі камфорт у іх удала спалучаецца са спецыфікай сельскага быту.

Інтэнсіўнае развіццё індустрыяльнага домабудавання дае магчымасць амаль палавіну ўсіх жылых будынкаў узводзіць у вёсках у поўназборным выкананні.

Г. ЯФІМАЎ.

І КНІГІ, І ГРОШЫ...

Больш як 30 гадоў жыхар пасёлка Акцябрскі Гомельскай вобласці Антон Зелянкевіч займаецца калекцыяніраваннем кніг, часопісаў, газет, марак, манет. У яго бібліятэцы налічваецца каля трох тысяч кніг самых розных гадоў выдання.

Вялікую цікавасць уяўляе філатэлістычны альбом, дзе сабраны маркі больш чым 50 краін свету. Сярод іх — першыя маркі маладой савецкай дзяржавы.

У нумізматычным зборы энтузіяста манеты розных краін і эпох. Ёсць і такія, якім споўнілася па тры стагоддзі.

У дом Зелянкевіча штодзённа прыходзіць мноства газет і часопісаў. Выпісвае ён і замежную перыёдыку. Літаральна з кожным днём калекцыя папаўняецца новымі экспанатамі. Збор А. Зелянкевіча карыстаецца папулярнасцю ва ўсіх, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі.

В. ЛОЎГАЧ.

ІНДУСТРЫЯ ПТУШКАГАДОЎЛІ

Будаўніцтва буйнейшай у рэспубліцы птушкафабрыкі, на якой штогод вырошчвацца дзвесце тысяч гусей, пачалося ў Барысаўскім раёне. Гэта механізаванае прадпрыемства зможа пастаўляць 10 тысяч цэнтнераў дыэтычнага мяса і каля паўмільёна яек.

У рэспубліцы завершан перавод птушкагадоўлі на прамысловую аснову, і з пачатку пяцігодкі больш чым удвая павялічылася вытворчасць яек. Яна перавысіць у гэтым годзе 1,1 мільярда штук. Ва ўсіх галінах створаны птушкагадоўчыя аб'яднанні. На буйных фабрыках сканцэнтравана вырошчванне мясных куранят-бройлераў, качак, індыкоў.

Я. ГАЛКІН.

Мікола КУТАС

* * *

Яшчэ не трубяць халады,
яшчэ не выспела каліна,
а клён —
стары і малады —
пажоўк лісцём напалавіну.
І над ракой ужо радзей
шчыруе галасамі ранак.
Каўнер з вільготнага туману
зара прымервае штодзень.
Размову з вераснем вяду.
Я рады восені сягоння:
яе зямную дабрату
нясу ў натруджаных далонях.



пішуць землякі

КАЛІ ПАРАЎНАЦЬ

Не забыў і ніколі не змагу забыць, што першыя крокі па зямлі я зрабіў у невялічкай палескай вёсцы Гарбаха. Так ужо атрымалася, што ў трынаццаць год я апынуўся па той бок акіяна, упершыню пачуў чужую, незразумелую мне англійскую мову, «пераварыўся» ў амерыканца.

Цяпер я жыхар невялікага па амерыканскіх маштабах горада Ракфорда, што знаходзіцца за паўтараста кіламетраў ад Чыкага. Працую рабочым на вінтарэзным заводзе. Жонка мая, полька па нацыянальнасці, таксама рабочая. Маем дзвюх дзяўчынак — двух- і пяцігадовага ўзросту. Маем дах над галавой і нядрэнны заробак.

Я не належу ні да якой палітычнай партыі, не з'яўляюся членам якога-небудзь нацыянальнага клуба. Вось чаму тым словам, якія я маю намер зараз сказаць, можна верыць, бо я не збіраюся хваліць ці ганіць ні амерыканскі, ні савецкі лад жыцця. Проста хочацца выказаць тое, што ўбачыў, падзяліцца ўражаннямі ад маёй паездкі на Палессе, крыху параўнаць наша і ваша жыццё.

Я даўно імкнуўся папасці ў край, дзе нарадзіўся, але спачатку мне гэта не ўдавалася. Таму палічыў за шчасце, атрымаўшы дазвол на турысцкую паездку па Львоўскай вобласці. Трапіў у Саюз і загарэўся надзеяй — пабываць у сваякоў у Гарбасе. Калі дабіраўся, думаў: пазнаю і сваю вёску, і суседнія—Варацэвічы, Іванава пазнаю. Але прыйшлося вачам сваім не верыць: цэрквы ў Іванаве ды Варацэвічах—вось і ўсё, што напомніла мне аб відовішчы трыццацігадовай даўнасці. Астатняе змянілася непазнавальна: прыгожыя, што званы, вясковыя дамы, прыгожыя будынкі ўстаноў, магазінаў, сталовых...

А я ж памятаю, як пры Польшчы пасвіў свіней, здолеў толькі два класы скончыць, урокі рабіў вечарамі пры лучыне. Карабок запалак у вясковай краме каштаваў тры яйкі... Сваякі ж мае жывуць заможна, нічога не скажаш. Замест лучыны — электралямпачкі ды тэлевізары, абстаноўка ў кватэры адмысловая, не ў лёху хаваюць кавалак мяса, а ў халадзільніку. Наогул, цяжка пералічыць усе змены ў іх жыцці за такі кароткі прамежак часу.

І што мяне надзвычай уразіла, дык гэта проста незвычайная гасціннасць маіх землякоў. Прызнаюся, спачатку крыху пабойваўся, што да мяне будуць адносіцца з падазронасцю, пагарджаць мною, што цяжка будзе з імі гутарыць. Замест жа гэтага сустрэў самую непасрэдную шчырасць у адносінах і размове, кожны запрашаў да сябе ў госці, са зразумелай цікавасцю слухаў мае расказы аб жыцці амерыканцаў. Спачатку мяне нават здзівіла багацце застолля калгаснікаў. І галоўнае, што ўсё гэта без аглядкі: маўляў, сёння ёсць і заўтра будзе. Адным словам, дружна, багата і цікава жывуць палешукі, пра калгасныя справы так гавораць, быццам гэта іх кроўныя клопаты.

Ну, а я ў адказ ім шчыра —пра сваё. Вось тут і атрымліваюцца параўнанні. Яны мне аб тым, што медыцынскае абслугоўванне ў вас бясплатнае, што дзяцей дзяржава вучыць, расходваючы на студэнта па шэсць тысяч рублёў, што жывуць людзі спакойна, злачынстваў штохвіліны не чакаюць, мараць толькі аб міры, а жыць яны будуць з кожным годам усё лепш і лепш. Я, са свайго боку, расказваю, што кожны працоўны чалавек Амерыкі таксама за мір. Памятаю, колькі дэманстрацый і маніфестацый прайшло толькі ў нашым горадзе, калі ЗША вялі брудную вайну ў В'етнаме і Камбоджы. На нашым заводзе працуюць прадстаўнікі шматлікіх нацыянальнасцей: шведы і нарвежцы, бельгійцы і палякі, немцы і італьянцы. Аднак кожны з іх казаў: «Што нам трэба ў В'етнаме? Ды нічога. Чаму ж тады гінуць там нашы дзеці?»

І цяпер кожны з нас задаволены тым, што адносіны паміж ЗША і СССР цяплеюць. Радуе нас развіццё гандлю паміж дзвюма краінамі. У палітыку я асабліва не ўнікаю. Але галасую за кандыдата ў прэзідэнты ад рэспубліканскай партыі. І гэта абгрунтавана не чым іншым, як перадвыбарнымі абяцаннямі рэспубліканцаў і далей наладжваць добрасуседскія адносіны з СССР. Згадзіцеся, што і на самой справе яно так: і Ніксан, і зараз Форд робяць разумныя крокі па гэтаму жаданаму для простых амерыканцаў шляху.

Я ўжо адзначаў, што матэрыяльна забяспечаны нядрэнна — у тыдзень атрымліваем разам з жонкай 280 долараў. Але матэрыяльныя даброты дастаюцца цяжкім шляхам. Напрыклад, дом сабе я купіў у крэдыт і дагэтуль яшчэ не выплаціў сем тысяч долараў доўгу. Каля тысячы долараў трэба выплаціць за легкавую аўтамашыну, якую я набыў, прадаўшы старую. У нас вялізная даргавізна, прычым цэны растуць няспынна. Праўда, улады спрабуюць кампенсаваць інфляцыю павышэннем заработнай платы, але яна значна адстае ад росту цэн, і ўзровень жыцця не расце, а падае. Так што размер заработку паняцце, па сутнасці, адноснае. Калі гадоў дзесяць назад я атрымліваў разы ў два менш, то ўсё роўна на тыя грошы мог купіць больш тавараў, чым зараз. Асабліва растуць цэны на жыллё. Калі я купляў сабе дом, то браў у крэдыт 20 000 долараў. Цяпер магу прадаць яго тысяч за сорак. Але выйгрышу мець не буду, бо гэтыя сумы раўназначныя: даюць сябе знаць інфляцыя і дэвальвацыя долара.

Мяне здзівіла, што ў вас людзі могуць спакойна хадзіць па вуліцы нават ноччу, у вёсцы рэдка хто, выходзячы з дому, замыкае дзверы. Мы ж з вечара нават думаць не можам, каб выйсці на вуліцу прагуляцца. Калі ўжо і намерышся падацца да кума ў госці, дык імчыш на «стрыт», як кажуць, на ўсіх парах. Інакш можна развітацца з кашальком, а то і з жыццём. Мне прыходзілася быць сведкам, калі сям'я пакідала свой дом па справах, а вярнуўшыся назад, убачыла ўзламаныя дзверы і ачышчаную ад грошай і дарагіх рэчаў кватэру.

Навінка для мяне і вашы сады-яслі. Мы з жонкай праз тыдзень мяняемся працаваць у начную змену, каб можна было дагледзець дзяцей. Паміж зменамі ў нас разбежка на сорак пяць хвілін, таму, ідучы на работу, аддаю малых суседзям, каб наглядалі за імі. І за гэта таксама плоцім.

Многа я мог бы прывесці яшчэ параўнанняў. Сказаў бы, напрыклад, што спадабаліся мне калгасныя палеткі. Аб тым таксама, што год навучання студэнта ў вышэйшай навучальнай установе абыходзіцца для амерыканскай сям'і амаль у тысячу долараў. Але лепш зраблю прыемнае для мяне заключэнне: я нават не чакаў, што так многа зрабіў савецкі народ за тры дзесяцігоддзі. І мару аб тым, каб праз некалькі гадоў зноў прыехаць на Палессе, але цяпер ужо ўсёй сям'ёй, паказаць сваёй жонцы, як жывуць цяпер мае землякі.

Іван БУЛКА.

ЗША.

ЯКУЦКІ МЕРЫДЫЯН

[Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.]

фронт — гэта самы пярэдні край грандыёзнай будоўлі, той асноўны рубеж, дзе расчышчаюць прасеку і насыпаюць чыгуначнае палатно, па якому працягнуцца шматкіламетровыя сталёвыя рэйкі.

ЗАЛАЦІНКА, СЯСТРА ЗАЛАЦІНКІ

Ля паўдзёвай граніцы Якуціі, дзе магістраль, што ідзе на поўнач ад Амура, перасякаецца з гаварлівай горнай рачулкай Іенграй, раскінулася якуцкае сяло з пяшчотнай назвай — Залацінка. Тут жывуць паляўнічыя і аленяводы. Раней гэтыя людзі не мелі пастаяннага месца жыхарства. А зараз у сяле добрыя дамы, школа-інтэрнат, паліклініка, магазіны, лазня. Народжаная Савецкай уладай Залацінка набывае цяпер сваю другую маладосць. Побач на сопцы расце буйны пасёлак будаўнікоў БАМа, таксама Залацінка.

Будаваць тут нялёгка. Хлопцы ўпарта дзяўблі цвёрдую, як камень, глебу, забівалі палі. А летам вечная мерзлата пад уздзеяннем сонца і дажджу месцамі ператварылася ў сапраўднае балота. Уручную давялося падносіць па такой «дарозе» цяжкія сценавыя шчыты. Я прыглядаўся да хлопцаў. Стомленыя, мокрыя ад поту, але на тварах ні цені суму і працуюць усе з нейкім асаблівым натхненнем. А настае кароткі перакур — і быццам зусім не было мінуту назад гэтых самых шчытоў і цяжкай работы.

— Вось заплюшчу вочы — і бачу, якім будзе тут першае верасня,— гаворыць цясляр Эдуард Гусар. — На адкрыццё школы збярэцца шмат народу. Будзе іграць аркестр, старэйшыя школьнікі прынясуць кветкі, а галоўнае — першакласнікі прыйдуць у новенькай форме, гордыя і шчаслівыя. Ну, няхай толькі паспрабуюць тут дрэнна вучыцца,— жартуе ён.

Сам Эдуард, ужо будучы ў Залацінцы, паступіў на завочнае аддзяленне Іркуцкага будаўнічага тэхнікума. Разам з ім у тэхнікум паступілі яшчэ дваццаць камсамольцаў. Ёсць у атрадзе і студэнты-завочнікі вышэйшых навучальных устаноў.

...Два месяцы прабыў я ў Залацінцы. Тэрмін невялікі. Але як шмат змянілася там літаральна на вачах! Дзе яшчэ вясной стаяла тайга, сёння красуюцца новыя, «з іголачкі» адміністрацыйныя будынкі, жылыя дамы, школа на 320 месц, сталовая, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, магазіны... А брыгада былога мінскага будаўніка Аляксандра Дзідзенкі датэрмінова зрабіла прасеку ў тайзе для будучай магістралі.

З кожным днём мнагалюдней становіцца ў пасёлку. Згулялі ўжо больш дзесятка камсамольска-маладзёжных вяселляў. Будуючы вялікую магістраль, моладзь будуе сваё новае жыццё, свой лёс і шчасце.

* * *

...Шмат пісем прыходзіць у адрас будаўнікоў БАМа. Нядаўна байцы ўдарнага атрада атрымалі з Мінска самае дарагое для ўсіх пісьмо — ад Веры Паўлаўны, маці Мікалая Кедышкі.

«Атрымала вашы пісьмы, у якіх вы паведамляеце аб сваіх справах,— піша яна.— Я вельмі кранута ўвагай і радуюся вашым поспехам. Добра разумею, што вам нялёгка, і гордая тым, што вы з гонарам спраўляецеся з пастаўленымі перад вамі задачамі. І мне хочацца сказаць вам — малайцы! Радуеце вы маё мацярынскае сэрца».

Вера Паўлаўна прыслала камсамольцам Залацінкі фатаграфію свайго сына. І напісала: «Няхай і ён будзе побач з вамі на будоўлі БАМа».

«ХАУ А Ю, ИРИНА? ХОРОШО?»

— мешая русские и английские слова, спрашивает медсестра, которая склонилась над детской кроваткой.

11-месячная ленинградка Ирина Чудновская лежит в лондонском госпитале «Бромптон» уже две недели. 15 августа ей сделали здесь операцию на сердце.

— Операция была тяжелой и продолжалась более 4 часов. Но закончилась успешно. Мы довольны самочувствием Ирины, она с каждым днем набирается сил. Думаю, через неделю выпишем ее из больницы,— говорит главный хирург госпиталя Кристофер Линколн, делавший операцию. — Ирина — наш первый русский пациент. Недавно советские врачи с блеском провели лечение английской девочки Фионы. И нам хотелось сделать все как можно лучше.

Семилетней Фионе Камминнгс из шахтерского поселка Сетон Барн около Ньюкасла угрожала полная слепота. «Мы не надеялись даже на чудо, но оно вдруг произошло»,— сказала позже мать Фионы. «Волшебниками» оказались врачи из Московского института глазных болезней имени Гельмгольца.

Фиону выписали из больницы как раз в тот, февральский день, когда в Москву с официальным визитом прибыл премьер-министр Великобритании Г. Вильсон. Среди документов, подписанных во время его визита, было межправительственное соглашение о сотрудничестве в области медицинской науки и здравоохранения. Именно в соответствии с этим соглашением в Лондон на лечение приехала со своей матерью Ирина Чудновская.

...Из больничного корпуса, где находится палата Ирины, с доктором Линколном переходим через оживленную Фулхам-роуд в другое здание. Здесь расположена административная часть госпиталя. Заместитель директора Гловер Джеймс ждет нас в своем кабинете. Он рассказывает, что «Бромптон» был открыт в 1841 году. Ныне это одна из лучших больниц страны. Особенно госпиталь славится своими специалистами в области сердечных и легочных заболеваний.

— Лечение Ирины стало для «Бромптона» большим событием. Хотелось бы, чтобы обмен пациентами между нашими странами успешно развивался. Так же как и обмен врачами, медицинской информацией. Мы, сотрудники госпиталя, готовы принять в этом самое активное участие, — подчеркивает Джеймс.

— Думаю, что так и будет,— вступает в разговор доктор Линколн.— Пример Фионы и Ирины развеял сомнения многих скептиков в Англии относительно полезности сотрудничества с Советским Союзом в области медицины. А объективные основания для укрепления этого сотрудничества, как, впрочем, и связи в других областях, налицо.

Михаил ОЗЕРОВ.

ЛОЖЬ ВО СПАСЕНИЕ

ЭТО БЫЛО любопытное письмо. Соотечественник из Англии Михаил Долич просил нашу редакцию:

«Сообщите, пожалуйста, сколько стоит коробка спичек в Советском Союзе. В английской газете я прочитал, что вы за нее платите рубль. Соврала, наверное, газета, но насколько — не знаю».

И в конверт было вложено вещественное доказательство — вырезка из газеты. В ответном письме пришлось послать читателю этикетку с коробки, на которой обозначена копеечная цена.

Цена спичек — вроде бы и мелочь. Но в этом случае масштаб газетного вранья можно было определить с арифметической точностью как один к сотне. Причем газета сотворила ложь со знаком плюс — к одной копейке прибавила 99, высосанных из пальца. Бывает ложь и со знаком минус, когда успехи нашей страны уменьшаются во сто крат.

Приехал однажды в Минск американский турист Иосиф Светин. Побывал он в колхозе и затем с удивлением сказал: «Деревни ваши красивые, дома колхозников просторные и чистые, крестьяне живут в достатке, а на лицах у них — бодрость и оптимизм». «А какими вы представляли наши деревни до сих пор?» — спросили у него. «Бедными и грязными, а колхозников — оборванными и голодными, — ответил он. — Так пишет американская пресса».

Известно, что о Советском Союзе так пишет почти вся буржуазная пресса на Западе. Она замалчивает или приуменьшает наши достижения и раздувает до невероятных размеров трудности и недостатки. А плюс на минус, как известно, всегда дает минус — миллионы людей в капиталистических странах до сих пор крайне плохо осведомлены о жизни советского общества.

О характере и размерах дезинформации можно судить по выступлениям «правдивых» буржуазных газет, вроде той, которая повысила цену на советские спички. Но есть еще, как видно на примере вышеуказанного американского туриста, и другой способ убедиться в лживости антисоветской пропаганды — понаблюдать за поступками и высказываниями людей, обманутых и сбитых с толку этой пропагандой.

В городской поселок Видзы, что на Витебщине, вернулся из Аргентины старый рабочий. Приехал он к своей дочери, учительнице. И привез из-за океана большой и тяжелый багаж. Вы никогда не догадаетесь, что было в тех огромных деревянных ящиках! В них был сапожный инструмент: молотки, клещи, плоскогубцы, рашпили, ножи, колодки. «Эти вещи должны быть у вас дороже золота, — всерьез сказал старик дочери. — Продадим их и получим много денег». Сдерживая улыбку, дочь слушала его слова и молчала. И жалела, что за перевозку пароходом такого количества металла отец совершенно зря заплатил большую сумму денег. Зря потому, что инструмент оказался никому не нужным — он валяется в сарае по сей день. Лишь одну ценность извлекла учительница из тех ящиков—понимание того, что в Аргентине лгут о жизни советских людей и что жертвой лжи стал ее отец.

Другой наш земляк привез из Америки своим родственникам в Сморгонский район полный чемодан мыла. Колхозники, в отличие от деликатной учительницы, от души потешались над незадачливым земляком. «А мыло-то зачем?» — спрашивали они. «Как зачем? Это ведь подарок, — оправдывался гость, не понимая нелепости своего поступка. — У вас, слыхал я, трудно купить мыло. Вот и получите каждый по куску».

Еще один земляк из Соединенных Штатов в гостинице «Юбилейная» разменял на мелкие купюры стодолларовую бумажку, чтобы одарить каждого из деревенских родичей по одному доллару и тем самым «осчастливить» их, «бедных и нищих».

В подобных ситуациях людям бывает и смешно, и неудобно. Но не о том речь. Люди совершают нелепые поступки в результате искаженного представления о советской действительности, они — жертвы лжи. Так называемая «свободная» и «правдивая» буржуазная пресса обманывает своих читателей, фальсифицирует, извращает факты, клевещет на советскую страну и социалистический строй.

Было бы неверно утверждать, что на Западе не пишут и не говорят правды о Советском Союзе. Там издаются коммунистические и рабочие газеты, там есть честные и смелые журналисты, там теперь иногда просто невозможно утаить правдивую информацию. Но правда о мире социализма там не в почете, высказывать ее подчас даже опасно.

Характерно признание издающейся в Лондоне газеты «Лиснер». Она пишет: «В британских газетах очень бедно освещается жизнь в Советском Союзе. В основном материалы о советской действительности носят негативный характер. А главное, читатели из этих статей получают искаженное представление о последних событиях в СССР. Особенно приглушенно освещаются социальные аспекты жизни в СССР. А ведь читателей очень интересует, как организованы там здравоохранение, наблюдается ли в СССР инфляция, есть ли проблема безработицы. Сотни таких вопросов, актуальных для Англии, вообще не затрагиваются в статьях об СССР, а если и затрагиваются, то только для того, чтобы подчеркнуть какие-нибудь недостатки».

Почему же так происходит? Почему английская, американская, западногерманская, французская буржуазная пресса не сообщает о том, что в Советском Союзе нет инфляции, нет безработицы, экономического спада и т. д.? Прежде чем ответить на этот вопрос, приведем еще один пример, взятый из бурной политической жизни Португалии.

В этой стране, как известно, проходит острая борьба между левыми, прогрессивными силами и реакционными, антикоммунистическими, профашистскими. Самыми стойкими и последовательными борцами за лучшее будущее страны и ее народа являются португальские коммунисты. Подорвать их огромный авторитет, отстранить от активного участия в политической жизни хотели бы фашисты и другие реакционеры. Однако коммунисты и их лозунги пользуются широкой поддержкой в обществе. Не имея возможности подавить компартию силой, буржуазия клевещет на нее, распространяет антикоммунистическую ложь. Так, по сообщению газеты «Юманите», католические круги Португалии распространяют среди верующих бюллетени, в которых пишут, будто в социалистических странах пожилых людей убивают, что женщины там общие, что денег нет совсем, потому что продовольствие распределяется по карточкам и тому подобное.

Нетрудно догадаться, что бредни эти используются буржуазией с целью самосохранения — вчерашние палачи страшатся португальского народа и его авангарда — коммунистов. И они злобно лгут. Применяют ложь во спасение.

Точно также ложь во спасение применяет вся буржуазная пресса. Ибо если открыто сказать о том, что в Советском Союзе нет инфляции, нет безработицы, то трудовые люди задумаются: а чей социальный строй лучше? Для монополий же этот вопрос чрезвычайно опасный. И потому она пуще огня боится правды. Вот в чем причины лжи.

Но люди в капиталистических странах знают подлинную цену «правдивости» желтой прессы. И потому многие из них стремятся увидеть Советский Союз собственными глазами.

По туристской путевке минувшим летом приехала к нам из Канады Джозефина Фабрис. От нее мы услышали давно знакомые слова: «Очень хотелось мне посмотреть вашу страну, да дома отговаривали ехать. Говорили, что пожалею, если поеду. И я решила не ждать конца тура, а вернуться из Москвы через пару дней. А в Москве изменила мнение. Оказывается, ваша страна интересная, люди — доброжелательные и приветливые, совсем не такие, как мне вас представили в Канаде...»

Повторяю: такие слова мы часто слышим от приезжающих из США, Англии, Канады, ФРГ. Значит, кому-то не по душе поездки в Советский Союз, кто-то хотел бы держать людей подальше от нашей действительности. Поэтому туристов запугивают, стращают их тюрьмой, Сибирью, сочиняют всевозможные небылицы, лишь бы они не ехали в Советский Союз. Сионистская газета «Новое русское слово» из года в год штампует на своих страницах фальшивку о том, якобы в Ленинграде питьевая вода заражена инфекцией. Сионисты, кстати, давно уже стали рекордсменами антисоветской ненависти, и лживость западной буржуазной прессы в отношении СССР — в значительной степени плод их стараний.

Размышляя над этими фактами, нельзя не вспомнить Заключительный акт Совещания по безопасности и сотрудничеству в Европе, под которым стоят подписи руководителей европейских государств, США и Канады. В документе совещания ясно и недвусмысленно говорится, что все государства-участники «намереваются способствовать развитию туризма на индивидуальной или коллективной основе», а также «сознавая потребность во все более широком знании и понимании различных аспектов жизни других государств-участников, ...ставят своей целью облегчать более свободное и широкое распространение всех форм информации...»

Хорошие намерения, прекрасные цели! Но, судя по конкретным фактам, они пока не реализуются на Западе. Там по старой традиции на страницах газет плещутся волны лжи, а противники мирного сосуществования и сотрудничества народов продолжают сеять вражду и подозрительность. Напрасный труд! Правда о первой стране социализма пробьет себе дорогу и станет достоянием миллионов.

Владимир БЕГУН.

НАШЫ ВЫДАННІ

Іван сачанка

Дык хто такія беларускія «патрыёты»? Гэта злачынцы, здраднікі, калабаранты, што служылі гітлераўскім фашыстам у час вайны, а зараз служаць імперыялістычным разведкам. А чаму яны названы патрыётамі ў двукоссі? Таму што патрыётамі яны ніколі не былі і не з'яўляюцца зараз, хаця і называюць так сябе самі.

Беларускі вучоны Іван Сачанка паставіў перад сабой задачу выкрыць хлуслівы «патрыятызм» Астроўскага, Станкевіча, Хмары, Арсеньевай і іншых адшчапенцаў. Ён параўнаў іх словы і справы і, на прыкладах выступленняў беларускай прэсы ваенных гадоў, паказаў, як адносіўся да іх злачынай дзейнасці беларускі народ, як іх выкрывалі беларускія пісьменнікі ў сваіх палымяных і гнеўных выступленнях. Атрымалася глыбока пераканаўчае і цікавае даследаванне.

Зараз, напрыклад, беларускія нацыяналісты заяўляюць аб тым, нібыта яны, супрацоўнічаючы з фашыстамі, дзейнічалі на карысць беларускага народа. Такія «смелыя» выказванні часта можна сустрэць у газеце С. Станкевіча «Беларус» і ў газеце С. Хмары «Беларускі голас». Іван Сачанка піша: «За нявыхад на работу, няўплату ў тэрмін падаткаў фашыстам, нязначную правіннасць С. Станкевіч загадваў учыняць крывавыя расправы перад натоўпамі прымусова сагнаных на плошчы людзей. Арганізаваўшы шпіёнскую агентуру, здраднік знішчаў камуністаў, актывістаў Савецкай улады і «палітычна ненадзейных». У адным з данясенняў нямецкаму камандаванню ён дамагаўся паслаць у кожны населены пункт моцныя гарнізоны аховы для барацьбы з партызанамі».

У гады вайны нацыяналісты выдавалі часопіс «Беларус на варце». Фотакопію вокладкі аднаго з нумараў гэтага часопіса, на якой змешчан партрэт Гітлера, чытач знойдзе ў брашуры. І знойдзе таксама факты аб «патрыятычнай» дзейнасці С. Хмары (Сіняка). Аўтар прыводзіць яго словы, надрукаваныя ў часопісе ў 1943 годзе. Хмара пісаў: «У нас нарадзіўся, калі можна так сказаць, апетыт да зброі, і гэтую справу рушаць нашыя абуджаныя нацыянальныя пачуцці». «Дорага абышоўся беларусам гэты звярыны «апетыт»,— чытаем мы ў брашуры.— Там, дзе з'яўляліся галаварэзы «краёвай абароны», лютавала смерць, гарэлі вёскі, гінулі старыя і малыя».

Гэткі «патрыятызм» быў ва ўсіх нацыяналістаў, якія разам з гітлераўцамі дабіваліся «новага парадку» ў Еўропе.

Аўтар брашуры прааналізаваў сапраўднае патрыятычнае змаганне беларускіх пісьменнікаў з гітлераўскімі акупантамі і іх памагатымі. Ён разглядае выступленні ў друку і па радыё Я. Коласа, К. Чорнага, М. Машары, І. Гурскага, К. Крапівы, П. Глебкі і іншых паэтаў і празаікаў. Яны выкрывалі нацыяналістычную хлусню, нікчэмныя спробы здраднікаў падвесці «навуковую базу» пад свае злачынныя планы.

Гаворачы аб сучаснай дзейнасці нацыяналістычных недабіткаў, аб намаганнях выдаць сябе за «патрыётаў», І. Сачанка піша, што «нічым, ніякай хлуснёй, ніякім словаблудствам і падхалімствам ім нельга апраўдаць сваё крывавае мінулае... Хлусня, перакручванне фактаў, антыкамунізм паказваюць усю іх сістэму падману і ашуканства». Прачытаўшы брашуру, людзі пераканаюцца ў праўдзівасці гэтых слоў.

В. ВЫСОЦКІ.

ІТАЛЬЯНЦЫ ВЫВУЧАЮЦЬ РУСКУЮ МОВУ

У гэтым годзе ў пятнаццаці гарадах нашай краіны створаны кароткатэрміновыя курсы рускай мовы для замежных грамадзян.

У беларускую сталіцу прыехала сорак італьянскіх выкладчыкаў, студэнтаў, служачых. Заняткі з імі па спецыяльнай праграме праводзяць высокакваліфікаваныя педагогі.

Знаходжанне італьянскіх гасцей у Савецкім Саюзе не толькі ўзбагаціць іх веданнем рускай мовы, але і дапаможа бліжэй пазнаёміцца з жыццём нашага народа, яго культурай, гісторыяй, дасягненнямі навукі і тэхнікі.

Віцебск. Маскоўскі праспект вечарам.

Фота М. ШМЕРЛІНГА.

МЫ—БЕЛАРУСЫ

З ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІМНА

Дваццаць гадоў таму назад усе рэспубліканскія газеты паведамілі, што папулярная на Беларусі песня «Мы — беларусы» Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР зацверджана Дзяржаўным Гімнам Беларусі. Сам указ, набраны буйнымі літарамі, тэкст і ноты гімна надавалі першым палосам газет незвычайнасць, урачысцасць. Так, гэта было вялікае свята беларускага народа.

Зацвярджэнне першага афіцыйнага беларускага гімна сведчыла аб далейшым умацаванні беларускай савецкай дзяржаўнасці на аснове паслядоўнага ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі. Пра гэта марыла не адно пакаленне слаўных сыноў нашага народа. Шмат калісьці думаў і дбаў пра беларускі гімн Янка Купала. Яшчэ ў 1920 годзе ён заклікаў творчую інтэлігенцыю стварыць урачыстую песню ў гонар беларускага народа. «Мы, беларусы, — пісаў ён, — дзякуючы ўсялякім гістарычным і палітычным безгалоўям нашай Бацькаўшчыны, вечна цягнуліся ў хвасце сваіх суседзяў ды яшчэ цяпер не можам у шмат якіх справах зраўняцца з імі. ...Я хачу тут звярнуць увагу на справу беларускага гімна. Справа гэта важная, і трэба, канечне, каб наша ідэёвая інтэлігенцыя — паэты і кампазітары заняліся ёй паважна».

Аднак у тую пару не выдалася магчымасці стварыць беларускі гімн. Пытанне аб яго стварэнні было пастаўлена зноў у 1943 годзе, калі ўрад Беларусі аб'явіў адпаведны конкурс. Паэтычныя тэксты на конкурс падалі Анатоль Астрэйка, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Максім Танк, Міхась Клімковіч. Адпаведна на кожны з іх была створана музыка. Аднак конкурсная камісія ні адзін з іх не зацвердзіла ў якасці нацыянальнага гімна БССР. Напісаныя з нагоды аб'яўленага конкурсу, яны паўтаралі адзін аднаго ў тэксце, не адпавядалі поўнасцю тым патрабаванням, якія ставіліся перад імі: ім не ставала эмацыянальнай выразнасці, глыбокага абагульнення, у нейкай ступені мастацкай завершанасці. Разам з тым конкурсная камісія паасобныя творы рэкамендавала да выканання і публікацыі. Гэта былі песні «Мы — беларусы» Мікалая Аладава і Нестара Сакалоўскага на словы Міхася Клімковіча, «Шумі, наша слава» Самуіла Палонскага і Анатоля Багатырова на словы Петруся Броўкі і шэраг іншых.

У 1944 годзе конкурс па стварэнню Дзяржаўнага Гімна БССР быў працягнуты. На словы Міхася Клімковіча «Мы — беларусы» напісаў музыку Пётр Падкавыраў. Праз два гады, у 1946 годзе, Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдала зборнік «Песні Вялікай Айчыннай вайны», у які былі ўключаны ўсе тры песні на словы Клімковіча. Аднак у прафесійных і самадзейных мастацкіх калектывах найбольшую папулярнасць набыла песня на мелодыю Нестара Сакалоўскага. У першыя пасляваенныя гады яна была, бадай, самай любімай песняй на Беларусі. Пра гэта сведчыць і стваральніца Азершчынскага калгаснага хору Таццяна Лапаціна: «Песню «Мы — беларусы» многа і часта спяваў наш хор. ...Мы адчувалі, што гэта наша, родная песня».

Адчуванне, што «гэта наша, родная песня», спакваля перадалося ўсяму народу. Яе спявалі тысячы харавых гурткоў, гарады і вёскі. Яна часта гучала па радыё. Яе чулі беларускія пушчы і рэкі. Была яна ў рэпертуары Дзяржаўнага хору БССР пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Рыгора Шырмы, народнага хору БССР, які тады ўзначальваў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Генадзь Цітовіч.

Аднак не ўсё задавальняла аўтара тэксту. Ёсць сведчанне, што Клімковіч дзесяткі разоў дапрацоўваў тэкст, шліфаваў радкі, дамагаўся іх мастацкай прастаты і выразнасці думкі. Значную перапрацоўку верша Клімковіч зрабіў у канцы 1949 года. У гэтым жа годзе перагледзеў музычную структуру песні і Нестар Сакалоўскі. Пасля перапрацоўкі песня, узбагачаная канкрэтнай фактурай і напоўненая дыханнем мірнай стваральнай працы, загучала больш урачыста.

Апошні раз Клімковіч вярнуўся да тэксту ў 1954 годзе, унёс шэраг важных паправак. Гэта была апошняя рэдакцыя твора, які прэтэндаваў стаць Дзяржаўным Гімнам Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Як сведчыць блізкі сябра Нестара Сакалоўскага журналіст Вітольд Няміра, кампазітар надзвычай усхвалявана ўспрыняў верш «Мы — беларусы». «Бачылі, якія словы! — усклікнуў ён, прачытаўшы верш Клімковіча. — Гучыць як гімн, як гімн беларускага народа!» На жаль, кампазітару не давялося дажыць да тае часіны, калі створаная ім песня была прызнана Дзяржаўным Гімнам БССР. Паўсюднае выкананне песні «Мы — беларусы» ў якасці Дзяржаўнага Гімна БССР было ўведзена ўрадам з 1 кастрычніка 1955 года.

З тае пары вось ужо дваццаць гадоў усякая ўрачыстасць, кожная важная гістарычная падзея, якая адбываецца ў рэспубліцы, адкрываецца выкананнем Дзяржаўнага Гімна Беларусі. Пад яго акорды пачынаецца і кожная працоўная раніца рэспублікі. Наш гімн гучыць па-дзяржаўнаму велічна і ўрачыста. Ён узнёсла апавядае, як мужнеў і гартаваўся ў бітвах беларускі народ, як разам з іншымі народамі нашай неабсяжнай краіны ўпэўнена крочыць «да светлае высі», у шчаслівае заўтра.

...Некалі герой трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» Андрэй Лабановіч з горыччу ў сэрцы казаў: «Кожны народ мае свой гонар... А мы, беларусы, не адважваемся прызнацца, што мы беларусы»...

Даўно ў мінулае адыйшлі тыя часы...

Сёння наш народ тыя ж самыя словы вымаўляе з поўным усведамленнем сваёй гістарычнай місіі. І гэтае ўсведамленне выказана ў першых жа радках нашага гімна, які так і пачынаецца: «Мы — беларусы».

Уладзімір СОДАЛЬ.

ВОСЕНЬ У КАРАЛІШЧАВІЧАХ

На семнаццатым кіламетры новай Магілёўскай аўтастрады ёсць дарожны знак «Апчак». Але нам у процілеглы бок — па траскучай жарстве гравійкі з кіламетр, не болей, туды, дзе відаць ужо крануты вераснёўскай пазалотай узлесак. Ледзь прыкметная ў хмызняку сцежка выведзе да паляны, на якой у кустах бэзу стаіць двухпавярховы драўляны дом, зрублены ў «чысты» вугал з круглых сасновых бярвенняў і пафарбаваны ў мяккі колер охры. Над высокім, у пяць прыступак, ганкам прыбіта мемарыяльная дошка: «У гэтым доме жыў і працаваў у 1950—56 гадах Народны паэт БССР Якуб Колас». На ціхай алейцы, што вядзе да пісьменніцкай харчэўні, пад шатамі старой разлапістай яліны ёсць лаўка... Тут ён любіў пасядзець, адпачыць, падумаць.

Даўно няма сярод нас дзядзькі Якуба, але прысутнасць яго адчуваецца ва ўсім. Дом творчасці беларускіх пісьменнікаў жыве па законах і правілах яшчэ той пары, калі па зацененых каралішчавіцкіх сцяжынках з палкай-спадарожніцай у руцэ хадзіў Колас. Адмысловы кій з алешыны або бярозы, аздоблены немудрагелістым узорам і адшліфаваны ад доўгай хады, заўсёды можна знайсці ў кутку ля ўваходных дзвярэй. Яго выразаў нехта з пісьменнікаў, седзячы дзе-небудзь у лясным зацішку, варушачы спакваля пласты сваёй памяці, каб знайсці яскравы вобраз, трапнае слова.

На адной са сцежак і натрапіўся нам Анатоль Вялюгін. У сінім спартыўным касцюме, у кедах, ён пайшоў насустрач і, прывітаўшыся, згадзіўся на некаторы час быць гідам. Ідучы побач з паэтам, мы стараліся не гаварыць, як гэта заведзена ў Каралішчавічах, на літаратурныя тэмы. Пра тое-сёе, пра надвор'е, пра настрой, толькі не пра літаратуру. Але без гэтага ўсё роўна не абыйшлося. Ды і як можна інакш, калі ад усяго навакольнага так веяла паэзіяй...

Вялюгін збочыў са сцежкі да высокай, стромкай бярозы, пашлёпаў далонню па белым ствале, адышоўся на крок, паказаў угару:

— Бачыце, вунь яна цёмным паскам падперазана. Гэта гадоў дзесяць таму я зняў з яе палоску бярозы — хацеў дачцы Ірыне нейкую забаўку змайстраваць. Тады ад зямлі да надрэза было з метр-паўтара, а зараз... Як час ідзе. Расце дрэва.

Потым ён павярнуўся да нас:

— У Багдановіча якраз пра гэта радкі ёсць... Памятаеце, у паэме «Вераніка»? Зараз успомню... ага, вось!

Я ў сад пайшоў — усё глуха, дзіка,
Усё травою зарасло,
Няма таго, што раньш было.
І толькі надпіс «Вераніка»,

АДВЕЧНАЯ ПЕСНЯ

ДА 175-ГОДДЗЯ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ «СЛОВА АБ ПАЛКУ ІГАРАВЫМ»

Расія, Украіна, Беларусь ужо восем стагоддзяў, без трынаццаці год, прыслухоўваюцца да вешчага голасу з Дзікага Поля, дзе крывава засеялі стрэлы затравянелы дзірван і лісіцы брэшуць на чырвоныя шчыты. Ён яшчэ да бяздонных глыбінь сваіх не расшыфраваны, гэты таямнічы і дзівосны голас.

«Сутнасць паэмы, — пісаў Карл Маркс Энгельсу, — заклік рускіх князёў да яднання якраз перад нашэсцем мангольскіх полчышчаў... Уся песня носіць гераічна-хрысціянскі характар, хоць язычаскія элементы выступаюць яшчэ вельмі прыкметна».

Вучоныя, даследчыкі «Слова аб палку Ігаравым» сцвярджаюць, што сёння навука аб ім сталася народная: выдатны помнік літаратуры Кіеўскай Русі вывучаюць і каменціруюць пісьменнікі, мастакі, кампазітары, педагогі, батанікі, арнітолагі, інжынеры, касманаўты. Не здзіўляйцеся — касманаўты. Юрый Гагарын у сваёй кнізе «Дарога ў космас» ставіць «Слова» ў шэраг кніг, якія нарадзілі ў душы хлопчыка са спаленай Смаленшчыны высокі напал вернасці Радзіме.

Чуючы ў прасторах часу магутны пошум крылаў невядомага генія, усе паэты схіляліся і схіляюцца прад арліным гняздом паэзіі. Гэта і праўда арлінае гняздо, адкуль зляцела, стаўшы на крыло, паэзія расійская, украінская, беларуская. «Злат стремень! Вот где точности и красоте языка учиться!» — усклікнуў Сяргей Ясенін, вывучаючы Песню песень.

Зямля Беларусі часта згадваецца ў «Слове аб палку Ігаравым». Захаваліся і цяпер назвы гарадоў, паселішчаў, рэк, якія сустракаеш на старонках паэмы.

На месцы аднаго з усходне-славянскіх паселішчаў на беразе Свіслачы, там, дзе злівалася з ёю рака Няміга, больш дзевяцісот гадоў таму пачаў мураваць Мінск. Дзе ж яна, былінная Няміга? Цяпер гэта ручай, загнаны ў бетонны калектар. Толькі карпатлівая хірургічная праца археолагаў аднаўляе мінулае на затравянелым кургане — драўляныя грабянцы і падсвечнікі, фрагмент керамікі і залаты бранзалет, шчыты з саломы... Глядзіш на глыбінныя знаходкі і чуеш з далёкай далечы тупат бітвы: «На Нямізе снапы сцелюць галовамі, малоцяць цапамі сталёвымі, жыццё кладуць на таку, душу веюць ад цела. Нямігі крывавыя берагі не дабром былі засеяны засеяны былі касцьмі сыноў рускіх...»

Ніколі не вяне росная лістота песеннай творчасці народу, густа шуміць у спаконвечнай кроне зялёнага Дрэва славян, якое сваімі дужымі карэннямі перапляло братнія сэрцы. І менавіта гэтыя ж глыбокія карэнні жывяць нашу паэзію!

Максім Багдановіч пісаў аб «Слове», асабліва яго ўразіла «Песня пра князя Ізяслава», каторы «пазваніў мячамі аб шаломы літоўскія... а сам, ізрублены, пад чырвонымі шчытамі, на крывавай траве, усхапіў на гэтае ложка славу і прамовіў: «Дружыну тваю, княжа, скрыдлы птах прыадзелі і звяры кроў палізалі». «Песня гэта наўсягды астанецца надзвычайным прыкладам згушчонасці пачування, сціснутасці руху выкладу. Быццам стрымваючы кожным словам душэўнае хваляванне, расказана цэлая жыццёвая драма і расказана так, што нічога не можна прыбавіць альбо адкінуць», — пісаў паэт.

Максім Багдановіч пераклаў вершам «Песню пра князя Ізяслава Полацкага»:

Ураніў самотна з цела
Ён душу ўдалую
Цераз пацерку на шыі,
Цераз залатую.
Засмуцілася вясёласць,
Песні замаўкаюць,
І жалобна, сумна трубы
У Гародні граюць.

Мною заўсёды канкрэтна ўспрымаліся дзівосныя радкі: «Ураніў самотна з цела ён душу ўдалую цераз пацерку на шыі...»—гэта кроў, кропля за кропляй. Толькі нядаўна даведаўся, што залатая пацерка — круглы або квадратны выраз у каўняры княжацкага адзення, аздоблены золатам ці каштоўнымі каменнямі. Даведаўся, а думаю, што паэт меў на ўвазе зусім не гэты пазлацаны выраз у каўняры. Такая ўлада паэзіі.

У лістападзе 1919 года газета «Беларусь» апублікавала «Слова аб палку Ігаравым» у празаічным перакладзе Янкі Купалы. Песню песень на роднай мове прачытаў вялікі паэт, і яна сталася зразумелай і блізкай нашаму чытачу, зачаравала таямнічасцю Дзікага Поля, дзе стаялі насмерць дружыны русічаў: «Тады князь Ігар уступіў у залатыя страмёны й паехаў па чыстаму полю. Сонца яму цемнатой заступіла дарогу: ноч, стогнучы грозьбы яму, разбудзіла птушню, а выцце звярынае ў стады іх збіла; Дзіў кліча паверх лесу, слухаць наказвае зямлі незнаёмай — Волзе і Паморʼю, і Пасуллю, і Суражу, і Карсуню, і табе, тмутараканскі балване!

А полаўцы нецярэбленымі шляхамі к Дону пабеглі вялікаму; толькі калёсы скрыпяць іх апоўначы, маўляў тыя лебедзі спуджаны.

Ігар к Дону войска вядзе.

А ўжо бяда яго пасець птаха па дзерэву; ваўкі па ярах нядобрае варожаць; арлы клекатам звярʼё завуць косці збіраць; лісіцы брэшуць на шчыты бліскучыя.

О зямля Руская, ты ўжо за рубеж перасягнула!

Доўга ноч танула ў мроку; зараніца досвіт набліжала; імгла поле засланіла; заснуў свергат салавейчы; гоман галічы ўзбудзіўся.

Русіны поле шырокае загарадзілі шчытамі бліскучымі, шукаючы чэсці сабе, а князю славы».

Восенню 1921 года ў Акопах быў завершаны вершаваны пераклад «Слова аб палку Ігаравым». Пад тэкстам цікавае

На ліпе ўрэзаны ў кары,
Казаў вачам аб той пары.
Расці, ўзмацовывайся, дрэва,
Як манумент жывы, ўставай
І к небу надпіс падымай.
Хай нерухомы словы спева:
Чым болей сходзіць дзён,
начэй,
Тым імя мілае вышэй.

Пасля ўжо ў размове высветлілася, што Анатоль Вялюгін «старажыл» Каралішчавіч. У 1950 годзе, недзе якраз такой парой, яны разам з Антонам Бялевічам прыехалі ў толькі што адкрыты дом творчасці адпачыць, папрацаваць. Час быў нялёгкі — толькі пачаў адбудоўвацца зруйнаваны вайною Мінск, пісьменнікі жылі ў няўтульных кватэрах. Тады і вырашылі ў Саюзе пісьменнікаў адкрыць гэты дом. Усе ўмовы, як кажуць, толькі пішы...

— Дарэчы, — засмяяўся Вялюгін,— Антон Бялевіч таксама зараз тут. Над новай паэмай працуе. Вы зайдзіце да яго, ён у другім пакоі жыве. Зайдзіце-зайдзіце, не бойцеся — ён гаспадар гасцінны!

У вялікім пакоі Бялевіча было светла. Вокны глядзяць на поўдзень, і таму праз яшчэ густую лістоту бэзу ў пакой прабіваюцца пругкія промні вераснёўскага сонца.

— А як ваша паэма?

— Яшчэ дзён дзесяць-пятнаццаць і — канец рабоце. А пішацца тут адмыслова.

Ён устаў з канапы і падыйшоў да стала, на якім акуратным стосікам былі складзены кнігі.

— Пра што паэма, пытаецеся? Пра Васіля Вашчылу — нашага сучасніка. Так-так, не здзіўляйцеся.

З вякоў сівых данеслі нам
быліны,
Як ворагаў Вашчыла пакасіў.
Магчыма, уцалелая галіна
Вашчылаўскага дрэва —
Наш Васіль...

— Тут, так сказаць, гістарычная паралель паміж маім героем — сакратаром райкома і кіраўніком сялянскага паўстання ў Крычаве ў XVIII стагоддзі. На чале з Вашчылам паўстанцы нейкі час трымалі Крычаў у сваіх руках. І мой герой прайшоў цяжкія выпрабаванні апошняй вайны, стаў добрым кіраўніком народных мас. У лютаўскім нумары часопіса «Полымя» паэма павінна выйсці ў свет.— Бялевіч паклаў рукапіс на стол, зняў акуляры. Па інтанацыі яго голасу, па выразу твару было добра відаць, што паэт задаволены работай і з гэтай прычыны ў яго добры настрой.

Трэці месяц працуе ў Каралішчавічах Сяргей Грахоўскі. За гэты час ён адрэдагаваў новы зборнік маладога паэта з Барысава Леаніда Рашкоўскага.

— Леанід вельмі здольны паэт,— гаворыць Грахоўскі.— І мужны чалавек: ужо каторы год ён прыкуты да ложка цяжкай хваробай. Але паглядзіце, якой жыццерадаснасцю прасякнуты яго вершы! Апошнюю кніжку ён напісаў для дзяцей. У ёй столькі замілавання прыродай, такі магутны імпульс жыцця!

Днямі Грахоўскі атрымаў з Масквы карэктуру сваёй аповесці «Рудабельская рэспубліка», якая перавыдаецца на рускай мове. Работы шмат. А тут яшчэ трэба давесці да ладу вершы для часопісаў. Толькі сябры-пісьменнікі казалі, што каго-каго, а Грахоўскага часцей за ўсіх можна ўбачыць на лясной сцежцы.

— Гулялі мы неяк з Алесем

Бачылам па прасецы. Раптам — лось! Вялі-і-ізны... Прычым, ён ужо настолькі асвойтаўся, што нічога і анікога не баіцца. Тут непадалёку хлопцы лінію электраперадач цягнуць, дык яны крычалі яму, крычалі — і вухам не вядзе! Ведае, чорт рагаты, што яго закон аберагае! Да Вялюгінавага доміка падыйшлі ўдвох адвячоркам і ў вокны заглядаюць! Старыя ўжо, аж памшэлыя... Сабакі забрахалі, спудзілі іх — адбегліся трохі і пайшлі сабе павольна так... Гаспадары!

Напярэдадні паехалі з Каралішчавіч два вядомыя празаікі — Вячаслаў Адамчык і Мікола Лобан. Па раману ў горад павезлі! Лобан, той дык наогул, паводле слоў Грахоўскага, усю трылогію тут напісаў. У Каралішчавічах распачаў ён у свой час работу над раманамі «На парозе будучыні» і «Гарадок Устронь», тут жа, у Каралішчавічах, закончыў трэцюю частку трылогіі, якую назваў — умоўна, вядома, — «Шэметы», па прозвішчу галоўных герояў.

Рыгор Семашкевіч у гэты дзень быў імяніннікам. Якніяк — трыццаць гадоў! За плячыма дзве кніжкі паэзіі, а ў выдавецтве чакае свайго часу першы празаічны твор — гумарыстычная аповесць «Бацька ў калаўроце». Першым сябра прыйшоў павіншаваць Рыгор Барадулін, які жыве ва ўтульным пакойчыку з верандай. Паэт Барадулін славіцца не толькі сваімі самабытнымі вершамі і паэмамі, але яшчэ — як вялікі майстра прыгатаваць духмяную чорную каву. Яшчэ, відаць, ні адзін госць не пайшоў ад яго, не паспытаўшы гэтага цудадзейнага пітва.

...Хутка, на вачах згасае вераснёўскі дзень. Барвы заходняга небасхілу адбіваюцца ў шыбах расчыненых вакон. Недзе з-за лесу далятае сюды гул матораў—гэта на гравійцы праходзяць выпрабаванні новыя БелАЗаўскія аўтамабілі. Тыдзень стаяла сухое надвор'е, і пісьменнікі штодня хадзілі на палеткі суседняга калгаса, заклапочаныя тым, што азімыя не ўсходзяць. Усе ўздыхнулі з палёгкай, калі прайшоў дробны, як праз рэшата, восенькі дождж, і збажына зарунела.

Ну, а Каралішчавічы? Ці знаходзіцца ў паэтаў і для іх узнёслае слова? А як жа!

...А бор, як бабыль у самоце,
Стаіць з сасноваю ліраю.

Гудуць нацятыя струны
Паміж зямлёю і хмарамі.
Якія ён думае думы,
Якімі авеяны марамі!

. . . .

І сівер у дрэвах не свішча
яшчэ,
Шырока і лёгка дышацца,
І вершы ў Каралішчавічах
Самі сабою пішуцца.

Гэта — Васіль Вітка. Верш так і называецца «Восень у Каралішчавічах»...

Развітваючыся з пісьменнікамі, мы яшчэ раз заглянулі да Анатоля Вялюгіна. Ён толькі што закончыў публіцыстычны артыкул да 175-годдзя першага выдання «Слова аб палку Ігаравым». Паэт з ахвотай згадзіўся надрукаваць яго ў нашай газеце.

Алесь ГАЎРОН.

НА ЗДЫМКАХ: каралішчавіцкі дом творчасці беларускіх пісьменнікаў; паэтэса Нелі ТУЛУПАВА; пад вечар Анатоль ВЯЛЮГІН разводзіць невялікае цяпельца; Антон БЯЛЕВІЧ чытае новую паэму; за хадою трапляюцца добрыя думкі — лічыць Сяргей ГРАХОЎСКІ.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

пазначэнне: «З старой на сучасную беларускую мову пераклажыў Янка Купала».

І празаічны і вершаваны Купалавы пераклады з'явіліся першым савецкім перакладам старажытнага помніка.

Геніяльная паэма пра мужнасць народную здзівіла свет, і ён пачаў з пільнай увагай углядацца ў задымленыя далечы нашай гісторыі. Паэма, азяная святлом даўняй культуры, стала сімвалам трываласці нашага духу.

Калі хмарамі рушылі орды на землі рускія, залатое «Слова» хавалі ў таемных манастырскіх спратах. Гэта быў толькі адзін спіс, змешчаны ў старажытна-рускім зборніку.

Аматар расійскай мінуўшчыны граф А. І. Мусін-Пушкін набыў запаветны зборнік у архімандрыта Спаса-Яраслаўскага манастыра. Дзякуючы намаганням графа, спіс апынуўся ў словалітні. Так і з'явілася першае выданне Песні песень. 175 гадоў мінула з той пары.

Калі Напалеон паліў Белакаменную, спіс паэмы захоўваўся ў бібліятэцы Мусіна-Пушкіна. Згарэў ягоны дом, і спіс той згарэў у маскоўскім пажары—толькі копія засталася.

Ліхалецці. Нашэсці. Спаленні...

На памяці нашай у навальніцах суровага сорак другога воіны з пяцікрылай зоркай на выцвілых пілотках пад вогненным валам згадвалі даўні кліч: «Ты бо можеши Волгу веслы раскропити, а Дон шеломы вычерпати».

У тых прыволжскіх ды прыдонскіх мясцінах тады балюча снілася Беларусь за курганамі. І яшчэ апёк сэрца светлы ўспамін: сонечны Мінск, актавая зала пединстытута, спагадная мілая ўсмешка прафесара Міхаіла Кузьміча Дабрыніна. Ён прапанаваў нам, студэнтам, зрабіць свае вершаваныя пераказы «Плачу Яраслаўны». Пераказы, у тым ліку і мой, былі, шчыра кажучы, вучнёўскімі. Але тут, на фронце, успаміналіся тыя радкі, — «Плач» загучаў па-новаму — гэтак рашуча і страшна скараціліся адлегласці гісторыі.

Пачарнела спелае калоссе,
хмары цяжка ходзяць над зямлёй.
У Пуціўлі на сцяне галосіць
Яраслаўна досвітнай парой:
— Заламаны ручанькі маланак,
я адна, гаротная, адна.
Палячу зязюляй на паляны —
з мечам меч сустрэліся з цьмна.
У журбе схілюся рана-рана
над рачным туманным серабром,
на магутным целе князя раны
абатру бабровым рукавом...

Пасля, на пачатку сорак трэцяга, у сціплай бібліятэчцы эвакуацыйнага шпіталя не знайшлося выдання Песні песень. І ўсё ж яна жыла ў душы, трывожылі душу родныя глыбінныя словы, якія караняцца на старонках старажытнай паэмы і дагэтуль трывала бытуюць у беларускай мове: «шызы», «крылца», «цвеліцца», «туга», «ратай», «клікнуць», «гадзіна», «вельмі», «вежа», «жалоба».

За крылом жалобным край палынны,
пад зарой чырвоная сцяна.
Яраслаўна плача безупынна,
як зязюля, на сцяне адна:
— Сонца, сонейка! Чаму так рана
падняло прасветлае чало,
у бязводным стэпе, за курганам,
лукі вояў смагаю звяло?
Заклікаю, валадар адзіны:
як паганец вытапча палі —
і мяне, і князя, і дружыну
лепш на попел полымна спалі!..

Вярнуўшыся на вызваленую бацькаўшчыну, я даведаўся пра школы партызанскія. Дзяцей вучылі ў лясных зямлянках. Паперы не хапала. Як патроны, як тол, бераглі паперу для падпольных газет і лістовак. Таму хлопчыкі і дзяўчаткі ў зялёнай школе вучыліся пісаць на бяросце. Бачыў я тыя шматкі бяросты, хвалюючыся, праз слёзы, чытаў па іх словы: «палон», «брэшуць», «вежа», «сцяг».

Сухім пергаментам бяросты
скрутак.
Мурашкі-літары... На сэрцы смутак:
пісаць вучылася палеская дзятва,
як вылі «юнкерсы» па сорак сутак,
гарэлі воблакі, і дрэвы, і трава.
Нястачы сведка — сшытачак з
раймага.
Па шоўку сонечнай кары адвага
вадзіла, пішучы, няўмелую руку:
«Радзіма. Вежа. Сцяг.
Палон і Смага».
Гучаць такія ж словы
ў «Слове аб палку»!
Гартала вечны лемантар дуброва;
суняўшы кашаль, грэлася ў пакровы
на папялішчах бесхацініца-вайна.
...Ніколі не загіне наша мова,
калі ў такім агні
не згінула яна.

Гісторыя і жыццё бессмяротнага «Слова» сведчаць: сталецці чытаюць сапраўдны мастацкі твор, і кожнае новае пакаленне ахоплівае розумам свaім глыбіні таямнічага і дзівоснага голасу генія чалавецтва.

Анатоль ВЯЛЮГІН,
пісьменнік.

ХРОНІКА КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

СКУЛЬПТАРЫ Мінскага вытворча-мастацкага камбіната Мікалай Андрэеў і Віктар Фёдараў заканчваюць работу над стварэннем архітэктурна-скульптурнай кампазіцыі «Нараджэнне паэта» для мемарыяльнага комплексу на радзіме народнага паэта БССР Янкі Купалы ў вёсцы Вязынка. Кампазіцыя будзе складацца з фігуры белага бусла і скульптуры «Мацярынства».

У ЛЬВОЎСКІМ Дзяржаўным тэатры оперы і балета ажыццёўлена пастаноўка новага балета народнага артыста БССР Я. Глебава «Ціль Уленшпігель». Яго паставіў галоўны балетмайстар тэатра, заслужаны дзеяч мастацтваў УССР М. Заслаўскі.

Па запрашэнню украінскіх калег на прэм'еры быў кампазітар Я. Глебаў.

НЯДАЎНА двухсерыйная шырокаэкранная мастацкая кінаэпапея «Полымя», пастаўленая рэжысёрам В. Чацверыковым на кінастудыі «Беларусьфільм», атрымала адну з галоўных прэмій VIII Усесаюзнага кінафестывалю ў Кішынёве.

Цяпер стваральнікі гэтай хвалюючай кінааповесці аб бессмяротным подзвігу партызан Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўдастоены яшчэ адной узнагароды — медалёў імя А. Даўжэнкі, якімі адзначаюцца лепшыя кінатворы на гераіка-патрыятычную тэму.

ШЧАСЛІВЫЯ ДЫВАНЫ МІНСКА

На працягу адзінаццаці дзён у Мінскім палацы спорту праходзілі паядынкі чэмпіянатаў свету па класічнай, вольнай барацьбе і барацьбе самба.

За права надзець чэмпіёнскі пояс змагаліся 353 спартсмены з 28 краін.

Першымі на дыван выйшлі «класікі». Тут адразу ж выявілася перавага савецкіх барцоў. Яны ўпэўнена і прыгожа праводзілі ўсе паядынкі. У саставе зборнай СССР быў і выкладчык Беларускага інстытута фізкультуры Уладзімір Зубкоў (вага да 48 кілаграмаў). Хоць, як кажуць, дома і сцены дапамагаюць, хваляванні балельшчыкаў за свайго земляка ад гэтага не былі меншымі: надта ж імянітыя саперніки дасталіся Зубкову.

У камандным заліку наперадзе зборная СССР — 8 залатых і 1 сярэбраны медаль; на другім месцы каманда Балгарыі — 2 залатыя, 1 сярэбраны і 3 бронзавыя медалі; трэцяе месца ў спартсменаў Польшчы — 3 сярэбраныя і 2 бронзавыя.

Што савецкая каманда пераможа, у гэтым мала хто сумняваўся. Але што з такім бляскам!.. Таму і не дзіўна, што рэпарцёр польскай газеты «Трыбуна люду» Януш Нікончык на пытанне: «Ці не можаце вы назваць самую яркую старонку чэмпіянату?» адказаў: «Восем медалёў савецкіх «класікаў».

Не меншую цікавасць выклікаў чэмпіянат свету па вольнай барацьбе. Іменна ў гэтым відзе ў свой час выступаў наш Аляксандр Мядзведзь — трохразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў і сямікразовы пераможца першынстваў свету. Дарэчы, за заслугі ў развіцці і папулярызацыі барацьбы яму ў час чэмпіянату ўручан «Залаты знак ФІЛА» — вышэйшая ўзнагарода Міжнароднай аматарскай федэрацыі барацьбы. А ў дзень яго 38-годдзя, 16 верасня, журналісты паднеслі спартсмену сюрпрыз. Па апытанню, праведзенаму сярод спецыялістаў, яны вызначылі, што А. Мядзведзь з'яўляецца лепшым барцом сучаснасці.

Выдатна выступіў дэбютант нашай зборнай П. Пінігін. Яго вызначае імкненне змагацца да канца. Так ужо здарылася, што ў фінале яму давялося сустрэцца з двума спартсменамі: манголам Ц. Нацагдоржам і балгарынам І. Юсеінавым. Незадоўга да заканчэння паядынка з манголам лік ачкоў быў нічыйны — 5:5. У такіх складаных абставінах Пінігін здолеў правесці прыём і перамог. З лікам 5:2 закончылася яго сустрэча з Юсеінавым. Так быў заваяваны першы залаты медаль зборнай СССР, якая дзевяты раз заняла агульнакаманднае першае месца — 4 залатыя, 3 сярэбраныя і 1 бронзавы медаль. На другім месцы каманда Балгарыі, на трэцім — Японіі.

Пасля «вольнікаў» гаспадарамі дывана сталі самбісты. Нашы хлопцы сур'ёзна адносіліся да кожнага паядынка. Іх абавязвала тое, што радзіма самба — Савецкі Саюз. І ў выніку — паўторан поспех барцоў класічнага стылю — 8 залатых, 2 сярэбраныя медалі.

Першае месца зноў у зборнай СССР, на другім — балгарскія, на трэцім — мангольскія барцы.

Зараз, калі чэмпіянаты ўжо закончыліся, успамінаюцца словы прэзідэнта ФІЛА Мілана Эрцэгана, якія ён сказаў у пачатку спаборніцтваў: «Вітаючы ўсіх удзельнікаў і суддзяў, афіцыйных асоб і гасцей, я спадзяюся, што турніры ў Мінску па трох відах барацьбы пройдуць у цёплай, сардэчнай абстаноўцы і будуць садзейнічаць умацаванню дружбы паміж народамі». Яго надзеі спраўдзіліся. Пакідаючы Мінск, былыя саперніки развіталіся як даўнія добрыя сябры.

В. РЫБІЦКІ.



НА ЗДЫМКАХ: адкрыццё чэмпіяната па барацьбе; на дыване — У. ЗУБКОЎ (справа) і К. КЭНКСОР (ЗША); галоўныя прызы ў трэнераў Польшчы, СССР, Балгарыі.

ЖОНКА ДАСТАЕЎСКАГА

Да свяшчэнніка сяла Дастоева (зараз Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці) у 1897 годзе прыйшло пісьмо. У ім гаварылася: «Мой нябожчык муж Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі шмат разоў гаварыў мне, што яго род паходзіць з (гістарычнай) Літвы ад Пінскага маршалка Дастаеўскага, выбранага ў сейм у 1598 годзе. Пётр Дастаеўскі і яго патомкі жылі ў Дастоеве»... Далей была просьба: прыслаць звесткі аб родзе Дастаеўскіх па царкоўных кнігах.

Гэтае пісьмо належала Ганне Дастаеўскай, якая нарадзілася 30 жніўня 1846 года ў сям'і дробнага пецярбургскага чыноўніка Рыгора Сніткіна. Род яе бацькі паходзіў з Палтаўскай губерні, і прапрадзед насіў прозвішча Снітко. Прадзед перасяліўся адтуль у Пецярбург і займеў ужо прозвішча Сніткін. Маці яе была па нацыянальнасці шведка, з сям'і вучоных рода Мільтапеус.

У 1867 годзе Фёдар Дастаеўскі ажаніўся з Г. Сніткінай. Аб тым, як гэта адбылося, мы знаходзім яго ўласны расказ у лісце ад 23 красавіка 1867 года да А. Суславай.

Па кантракту Дастаеўскі быў абавязаны выдаўцу Сцялоўскаму здаць да 1 лістапада новы раман не менш дзесяці друкаваных аркушаў. Было ўжо 4 кастрычніка, а ён яшчэ не пачаў пісаць твор. Тады яму параілі ўзяць стэнографа, каб дыктаваць раман, што паскорыла б справу. Прафесар стэнаграфіі Ольхін прыслаў Фёдару Міхайлавічу лепшую сваю вучаніцу, стэнаграфістку Ганну Сніткіну,

маладую і даволі прыгожую дзяўчыну.

Работа пайшла хутка. Друкаванне рамана «Ігрок» было скончана за 24 дні. У канцы работы над творам пісьменнік заўважыў, што дзяўчына шчыра кахае яго. Пасля смерці свайго старэйшага брата Міхаіла, як адзначаў Ф. Дастаеўскі, яму вельмі было сумна і цяжка жылося, і ён прапанаваў Сніткінай уступіць з ім у шлюб. Розніца ў гадах была вялікая: яму — 46 год, а ёй — 21. Але пісьменнік спадзяваўся, што дзяўчына будзе з ім шчаслівай. І не памыліўся ў гэтым.

Сучаснікі адзначалі, што Дастаеўскі ў асобе Ганны Рыгораўны набыў не толькі любячую жонку, але і практычную гаспадыню, разумную прыхільніцу яго багатага таленту, добрую памочніцу ў літаратурных справах. Нездарма ён прысвяціў ёй свой лепшы раман «Браты Карамазавы».

Ганна Дастаеўская пражыла доўгае і цікавае жыццё. Гэта яна пасля смерці пісьменніка прыклала шмат намаганняў па мемарыялізацыі яго жыцця. Яе па праву можна назваць кнігавыдаўцом, стэнографам, бібліёграфам, біёграфам, мемарысткай, заснавальніцай музея Ф. Дастаеўскага.

У канцы мая 1917 года Ганна Рыгораўна выехала з Петраграда на сваю дачу ў Крым. Неўзабаве захварэла там малярыяй. Калі ачуняла і збіралася вяртацца дамоў, надарылася перашкода ў сувязі з прыходам на поўдзень Расіі кайзераўскіх акупантаў. Пачалося гаротнае існаванне, якое ўскладнілася новай хваробай. 9 чэрвеня 1918 года яна памёрла і была пахавана на Ауцкіх могілках у Ялце.

Вядома, што пасля смерці мужа Ганна Дастаеўская ў растэрміноўку выплаціла грошы ў касу Аляксандра-Неўскай лаўры ў Пецярбургу за месца на Ціхвінскіх могілках, побач з магілаю Ф. Дастаеўскага. Яна нават захавала квітанцыю і расціску аб гэтым і ў «Завяшчальным сшытку» прасіла сваякоў пахаваць яе побач з мужам. Але тады гэта не было здзейснена.

9 чэрвеня 1968 года Саюз пісьменнікаў СССР пры актыўным удзеле ўнука пісьменніка, Андрэя Дастаеўскага, ажыццявіў перанос праху Ганны Рыгораўны ў Ленінград, на былыя Ціхвінскія могілкі Аляксандра-Неўскай лаўры, да магілы Фёдара Дастаеўскага.

Іван ШПАДАРУК.

НА ЗДЫМКУ: жонка Ф. Дастаеўскага. 1878 г.

ЗІМАРОДАК У ЛОДЦЫ

Прыемна парыбачыць на возеры Нарач. У гэты раз выехаў я на досвітку папаляваць на шчупака.

Любуючыся хараством прыроды, я памалу падвеславаў да пясчанай касы. І тут нечакана збоку ў маю лодку ўскочыла нейкая птушка, схавалася пад кармавую лавачку. Я думаў, што яна зараз жа паляціць, а птушачка сядзіць. Узяў яе ў рукі. Яна не супраціўлялася і даверліва глядзела мне ў вочы. І ў гэты час над галавой я пачуў лопат крылаў. Дык вось яно што: над намі кружыў каршун. Гэта ён і паляваў на зімародка.

М. БАХМЕТАЎ.

ГУМАР

Камандзіраваны муж цэлы дзень спрабуе дазваніцца дахаты, але тэлефон увесь час заняты. Нарэшце, страціўшы цярплівасць, ён пасылае жонцы тэлеграму: «Павесь трубку».

●

— Кажуць, ты развёўся яшчэ два разы з таго часу, як мы бачыліся.

— Што рабіць, я заўсёды выбіраю такіх цудоўных жанчын, што і іншыя хочуць на іх жаніцца.

●

— Як вы думаеце, чаму на шашы аварый значна больш, чым на чыгунках?

— Па дзвюх прычынах. Па-першае, ні адзін паравоз ніколі не спрабуе абагнаць другі, а па-другое, ці бачылі вы калі, каб машыніст цалаваўся на ходу з качагарам?

●

— Мама, сёння, калі прыйшлі госці, я зрабіў добрую справу.

— Якую?

— Брат непрыкметна паклаў сіньёру Дануці кнопку на крэсла.

— І што ты зрабіў?

— Я пачакаў, пакуль сіньёр пачаў садзіцца, і ў гэты момант адсунуў крэсла.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82, 33-02-80, 33-03-15, 33-01-97, 33-15-15.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі
Зак. № 1440.